В. С. Варапаева Т. С. Куцанава



# ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ

# 3

Частка 1

В. С. Варапаева Т. С. Куцанава

# ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ

Вучэбны дапаможнік для 3 класа
спецыяльных агульнаадукацыйных школ
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках

Частка 1

*Дапушчана Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

Мінск
«Выдавецкі цэнтр БДУ»
2011

Правообладатель Издательский центр БГУ

УДК 821.161.3.09(075.2=161.3)–056.313
ББК 74.3
В18

Рэцэнзент
кафедра беларускага і рускага мовазнаўства
факультэта пачатковай адукацыі ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(кандыдат педагагічных навук дацэнт кафедры
*В. І. Свірыдзенка*)

**Варапаева, В. С.**
В18 Літаратурнае чытанне : вучэб. дапам. для 3-га кл. спец. агульнаадукац. шк. з беларус. мовай навучання. У 2 ч. Ч. 1 / В. С. Варапаева, Т. С. Куцанава. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2011. — 119 с. : іл.
ISBN 978-985-476-874-8.

Вучэбны дапаможнік для 3-га класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ для дзяцей з цяжкімі парушэннямі маўлення, для дзяцей з цяжкасцямі ў навучанні з беларускай мовай навучання.

**УДК 821.161.3.09(075.2=161.3)–056.313**
**ББК 74.3**

**ISBN 978-985-476-874-8 (ч. 1)**
**ISBN 978-985-476-873-1**

© Варапаева В. С., Куцанава Т. С., 2011
© Афармленне. РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ», 2011

Правообладатель Издательский центр БГУ

## АД АЎТАРАЎ

Дарагія трэцякласнікі!

Вы трымаеце ў руках кнігу, у якой сабраны лепшыя творы беларускай літаратуры і вуснай народнай творчасці.

Вучэбны дапаможнік падзяляецца на дзве часткі.

Першую частку складаюць раздзелы «З крыніц народных...», «Восеньская старонка», «Мой родны кут! Як ты мне мілы!», «Зімовая старонка». У другую частку ўваходзяць раздзелы «Напісаў я казку — слухай, калі ласка!», «Сцежкі дзяцінства» і «Вясноваletняя старонка».

З народнымі песнямі, казкамі, скорагаворкамі, прыказкамі, легендамі вы пазнаёміцеся ў раздзеле «З крыніц народных...».

Пра нашу прыгожую і цудоўную краіну Беларусь, яе працавіты і добразычлівы народ вы даведаецеся з раздзела «Мой родны кут! Як ты мне мілы!».



Правообладатель Издательский центр БГУ

Весела ўсміхнуцца, паразважаць, зрабіць пэўныя вывады вам дапаможа раздзел «Сцежкі дзяцінства».

Непаўторнай прыгажосці роднай прыроды, адметнасці кожнай пары года прысвечаны раздзелы «Восеньская старонка», «Зімовая старонка», «Вясνова-летняя старонка».

Дабра вам і радасці на шляху пазнання!

*Аўтары*

**Умоўныя абазначэнні:**

 слоўнік

 чытае настаўнік

 чытае і тлумачыць настаўнік

?! пытанні і заданні

* заданне ўзмоцненай складанасці

Правообладатель Издательский центр БГУ



# З КРЫНІЦ НАРОДНЫХ...

## БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ ПЕСНІ

У кожнай пары года ёсць свае святы. У час гэтых свят людзі весяляцца, спяваюць песні. Песні звязаны з рознымі з’явамі прыроды і жыцця людзей у зімовы, вясновы, летні і асенні час.

## ВОСЕНЬСКІЯ ПЕСНІ

Восеньская праца і прыход новай пары года раскрываюцца ў восеньскіх песнях.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Восень мая, восень...

— Ой, восень мая,
Восень сцюдзёная,
Чаго ты рана захаладала?
— Я й не раненька,
Я й не позненька, —
Калі мая пара прыйшла:
Лісточак апаў, зямельку ўслаў,
Вось мая і пара прыйшла.
Рэчкі сталі, пазамярзалі,
Вось мая і другая пара.



?! **1.** З якім пытаннем звяртаюцца да восені? Прачытайце.

**2.** Знайдзіце ў тэксце і прачытайце адказ восені.

**3.** Пра якія свае дзве пары гаворыць восень? Прачытайце.

**4.** Як можна назваць першую пару восені? Другую?

**5.** Назавіце прыкметы ранняй і позняй восені.

**Сцюдзёная** — халодная.

## ЗІМОВЫЯ ПЕСНІ

Напярэдадні Новага года хлопцы, дзяўчаты, дзеці ходзяць па сялянскіх дварах і спяваюць вінша-



Правообладатель Издательский центр БГУ

вальныя песні-калядкі. Калядоўшчыкі бываюць у масках — казы, мядзведзя, бусла і іншых. Гаспадары выносяць калядоўшчыкам гасцінцы, а яны за гэта жадаюць ім у новым годзе шчасця, здароўя, добрага ўраджаю.

## КАЛЯДКІ

### Калядкі, калядкі

Калядкі, калядкі
Везлі бліны, аладкі
У маляваным вазочку,
На вараненькім канёчку.

**Вара́нenькі** — чорны.

### Го-го-го, каза

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэрая!
Наша козанька,
Дый залатая!
Ну-ка, козанька,
Павярніся,
Па новаму дому,
Па гаспадарскаму
Расхадзіся!





Правообладатель Издательский центр БГУ

Го-го-го, каза,
Го-го-го, шэрая!
Казанька-каза,
Каза добрая,
Бо дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць
І расце карысць.

**1.** Калі спяваюцца калядныя песні?
**2.** Для чаго калядоўшчыкі вадзілі казу? Як яны яе называюць?
**3.** Што калядоўшчыкі жадалі гаспадарам? Прачытайце.
**4.** Як людзі дзякуюць калядоўшчыкам?
**5.** З якім настроем варта спяваць гэтыя песні?

## МАСЛЕНІЧНЫЯ ПЕСНІ

Зіму праводзяць святам Масленіцы. Дарослыя пякуць бліны, а дзеці абходзяць двары, збіраюць бліны, катаюцца на санках. На Масленіцу спяваюць вясёлыя песні.

### Наша Масленіца гадавая

А мы Масленіцу чакалі
І ў ваконца паглядалі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Гару сырам набівалі,
Зверху маслам палівалі.
А ад сыру — гара сыру,
А ад масла — гара ясна.
А на двары сняжкі сыплюць,
А нас мамкі дамоў клічуць.

?! **1.** Калі святкуюць Масленіцу?
**2.** Якую пару года праводзяць гэтым святам?
**3.** Чым займаюцца ў час свята дарослыя і дзеці? Знайдзіце адказ у тэксце.
**4.** Які настрой перадаецца ў гэтай песні? Перадайце яго пры чытанні.

жа-ва-ро́-нач-кі, са́-дзі-кі, рас-квя-ці́-ла

## ВЯСНОВЫЯ ПЕСНІ

У пачатку сакавіка клічуць вясну: пякуць з цеста птушак, падкідваюць іх уверх і спяваюць вясновыя песні.

**Жавароначкі, прыляціце**

Жавароначкі, прыляціце,
Вясну красную прынясіце,
Каб сонейка засвяціла,
Каб снег белы растапіла,
Каб садзікі расквяціла.





Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** Хто звяртаецца да жавароначкаў?
**2.** Што прасілі людзі ў іх? Знайдзіце ў тэксце і прачытайце.
**3.** Знайдзіце словы з памяншальна-ласкальным значэннем.
**4.** Як вы разумееце выраз «вясна красная»?
**5.** Падумайце, якая мелодыя можа быць у гэтай песні.

## А ты, вясна, ты красна

— А ты, вясна, ты красна,
Што ты нам прынесла?
— А я прынесла, прынесла
Цёплае лета, ціхае.
І цёплую вадзіцу,
І цёплую вадзіцу.
З зямлі — травіцу.

?! **1.** Ці адрозніваецца гэта песня ад папярэдняй? Чым?
**2.** Што прынесла людзям вясна? Знайдзіце ў тэксце і прачытайце.
**3.** Якой вы ўяўляеце сабе вясну? Апішыце яе словамі.
**4.** Якую яшчэ песню пра вясну вы ведаеце?



Правообладатель Издательский центр БГУ

## ЛЕТНІЯ ПЕСНІ

Свята Івана Купалы адзначаецца ў ноч з 6 на 7 ліпеня. Дзяўчаты і хлопцы скачуць праз вогнішча, спяваюць купальскія песні, шукаюць кветку шчасця — папараць. Існуе народнае павер’е, што той, хто яе знойдзе, заўсёды будзе шчаслівы.

### Купальская песня

— Купалінка, Купалінка,
Цёмная ночка,
Цёмная ночка,
Дзе ж твая дочка?

— Мая дочка ў садочку
Ружу, ружу поліць,
Ружу, ружу поліць,
Белы ручкі коліць.

Кветачкі рвець,
Кветачкі рвець,
Вяночкі звівае,
Вяночкі звівае,
Слёзкі пралівае.

?! **1.** Прачытайце купальскую песню.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Ці ведаеце вы мелодыю да песні «Купалінка»?

**3.** Знайдзіце ў песні словы, якія ўжываюцца з памяншальна-ласкальным значэннем.

**4.** Вывучыце песню на памяць.

## ЖНІЎНЫЯ ПЕСНІ

У жніўных песнях расказваецца пра тое, як працавалі ў полі, як збіралі ўраджай, праслаўлялі яго.

### Жніўная

Гаварыла ядранае жыта:
— Не магу я ў полі стаяці,
Каласочка дзяржаці,
Толькі магу я стаяці
У полі капамі,
У гумне стагамі,
У клеці карабамі,
А на стале пірагамі.

**Жні́ўная** — песня, якую спявалі ў час уборкі ўраджаю.

**Гумно́** — будынак для складвання і абмалоту збожжа.

**Клець** — кладоўка, дзе захоўваюцца розныя рэчы.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Я́дранае жы́та** — саспелае жыта.

**1.** Прачытайце жніўную песню. Пра што ў ёй гаворыцца?
**2.** Што гаворыць жыта ў песні? Прачытайце.
**3.** Як трэба чытаць песню: у хуткім тэмпе ці павольна, напеўна? Чаму?

## ЛІРЫЧНЫЯ ПЕСНІ

Лірычныя песні не звязаны з абрадамі і календаром. Спяваюць іх за працай, у час адпачынку, у радасці і ў горы. Такія песні выказваюць розныя пачуцці, перажыванні. Лірычныя песні могуць быць вясёлыя, жартоўныя, а часам і сумныя.

### Рэчанька

— Ой, рэчанька, рэчанька,
Чаму ж ты не поўная?
Люлі, люлі, люлі,
Чаму ж ты не поўная?

Чаму ж ты не поўная,
З беражком не роўная?
Люлі, люлі, люлі,
З беражком не роўная?



Правообладатель Издательский центр БГУ

— А як жа мне поўнай быць,
З беражкамі роўнай плыць?
Люлі, люлі, люлі,
З беражкамі роўнай плыць?

Ясю коніка паіў,
Кася ваду чэрпала.
Люлі, люлі, люлі,
Кася ваду чэрпала.

?!

**1.** Вызначце, да каго звяртаюцца ў песні.
**2.** Прачытайце, пра што пыталіся ў рэчанькі.
**3.** Што адказвала яна? Хто вінаваты, што рэчанька не поўная? Знайдзіце адказ у песні. Ці рэчка жартуе, ці сапраўды вінаватыя Ясь і Кася?
**4.** Як вы прачытаеце песню (павольна, напеўна, хутка)?

## ЖАРТОЎНЫЯ ПЕСНІ

### Певунок

— Кукарэку, певунок,
Пашый сабе кажушок,
Пашый штонікі з шаўкоў,
З залацістых пaяскоў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

І пашыў, і надзеў,
І ў люстэрка паглядзеў,
І пашыў ён, і надзеў,
І ў люстэрка паглядзеў!
Усё!

?! **1.** Прачытайце песню.
**2.** Чаму гэтую песню называюць жартоўнай?
**3.** Як вы думаеце, ці падобна яна на маленькую казачку? Чаму?

блі-ску́-ча-га

* * *

Гого-гого, гусачок,
Зрабі хлопчыку свісток
З белага крыла
Ды з бліскучага пяра.

І зрабіў ён, і падаў,
І сыночак заіграў.

?! **1.** Прачытайце песню. Ці спадабалася яна вам?
**2.** Як яе трэба чытаць?
**3.** Знайдзіце ў песні словы, якія ўжываюцца з памяншальна-ласкальным значэннем.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Вывучыце песню на памяць.

ма-ла-ка́, за-пла́-каў, я́б-лык, па-ды́-ме

## ЛІЧЫЛКІ

* * *

Ту́ка-тука́,
Збанок малака.
Хто яго вып’е,
Той і выйдзе.

* * *

Бегаў заяц каля плота,
Ён шукаў сабе работу.
Ды работы не знайшоў,
Так заплакаў і пайшоў.

* * *

Каціўся яблык
Міма саду,
Міма саду,
Міма граду.
Хто яго падыме,
Той і выйдзе.

* * *

Тара-бара,
Дамоў пара
Кароў даіць,
Табе вадзіць.



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** Прачытайце лічылкі самі сабе. Якая з іх больш спадабалася? Чым?
**2.** Вывучыце адну лічылку на памяць.

## СКОРАГАВОРКІ

* * *

Прытупіў пілу Піліп —
Пілаваў
Паленне з ліп.



* * *

Прывучыць сароку —
Адна марока,
Сорак сарок —
Сорак марок.

* * *

Каток нітак клубок
Закаціў у куток.

?! **1.** Якая скорагаворка больш за ўсё вам спадабалася?
**2.** Навучыцеся хутка і без памылак чытаць скорагаворкі.
**3.** Вывучыце адну-дзве скорагаворкі на памяць.
**4.** Правядзіце конкурс на лепшага чытальніка скорагаворак.



Правообладатель Издательский центр БГУ

у-ра-джа́й, смач-не́й-шай

## ПРЫМАЎКІ І ПРЫКАЗКІ — МУДРАЙ МОВЫ ПРЫВЯЗКІ

### НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

#### Восень

Восень — на дзень пагод восем.
Увосень за стол просім.

#### Зіма

Багата снегу — багата хлеба.

#### Вясна

Вясна-красна багата кветкамі, а лета — снапамі.
Сухі сакавік, цёплы красавік,
мокры май — будзе добры ўраджай.

#### Лета

Лета збірае — зіма паядае.
Летні дзень год корміць.

### РАДЗІМА

Няма смачнейшай вадзіцы, як з роднае крыніцы.
Усякай птушцы сваё гняздо міла.



Правообладатель Издательский центр БГУ

най-смач-не́й-шы, па-сва-ры́-цца,
па-мі-ры́-цца

## НАВУКА, СЛОВА

Добра таго вучыць, хто хоча ўсё ведаць.
Вучыцца ніколі не позна.
Добрае слова не забываецца.
Слоўка як птушка: выпусціў — не вернеш.

## ПРАЦА

Хто рана ўстане, той многа зробіць.
Сёння зробіш — заўтра як знойдзеш.
Найсмачнейшы хлеб ад сваёй працы.
Ніякая праца не ганьбіць чалавека.

## СЯБРОЎСТВА

Не той сябар, хто мёдам мажа, а той, хто праўду кажа.

Лёгка пасварыцца, цяжэй памірыцца.

Што аднаму цяжка, тое гуртам лёгка.

?! **1.** Ці ўжываеце вы ў сваёй мове прымаўкі і прыказкі? У якіх выпадках?
**2.** Прачытайце прыказкі, у якіх вызначаны прыкметы розных пор года. Запомніце іх.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**3.** Вывучыце некалькі прымавак ці прыказак па жаданні.

**4.** З дапамогай настаўніка выкарыстоўвайце прымаўкі і прыказкі да пэўных тэкстаў у падручніку.

ча-ра-дзе́-ем, Ме́-нес-кам, раз’-яз-джа́ў, па-ся-рэ́-дзі-не

## ЛЕГЕНДЫ

Легенда — гэта апавяданне, падобнае на казку, пра якія-небудзь падзеі з народнага жыцця або з’явы прыроды.

### Адкуль узнік горад Мінск

Легенда расказвае, што горад гэты заснаваны нейкім асілкам і чарадзеем Ме́нескам. Ме́неск нібыта пабудаваў на рацэ Свіслач млын на сямі колах. У яго млыне мука малолася не з жыта, а з камення. У поўнач ён раз’язджаў на сваім млыне па дарозе і збіраў дружыну з дужых людзей. З іх потым утварыўся цэлы народ, які пачаў сяліцца побач з млыном чараўніка.

Мясцовасць, дзе жыў гэты чарадзей, пачалі называць Ме́нескам. А потым для хуткасці ў гаворцы назва стала Менск, а затым і Мінск.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Чарадзе́й** — чараўнік, вядзьмак.
**Млын** — будынак з устаноўленымі ў ім прыстасаваннямі для размолу зерня.

## Адкуль узнікла назва Гомель

Там, дзе цяпер стаіць Гомель, пасярэдзіне ракі Сож, некалі было шмат пяску. Каб плыты і баркі, што плылі па рацэ, не ўзбіваліся на мель, на беразе каля гэтага месца заўсёды стаяў чалавек і крыкам папярэджваў:

— Го! Мель! Го! Мель!

Вось і пайшло — Гомель.

**1.** Прачытайце легенды. Аб чым вы даведаліся з іх?
**2.** Перакажыце легенду, якая вам больш спадабалася.
**3.** Ці ведаеце вы легенду аб паходжанні свайго горада, вёскі?

# БЕЛАРУСКІЯ НАРОДНЫЯ КАЗКІ

## НАРОДНАЯ КАЗКА

Казка — выдумка. У ёй людзі з даўніх часоў выказвалі свае мары аб шчасці, аб перамозе дабра



Правообладатель Издательский центр БГУ

над злом, аб цудоўных і чароўных краінах, дзе хацелася б жыць. Яна складалася людзьмі, перадавалася імі з вуснаў у вусны, ад аднаго пакалення да другога — так узнікла **народная казка**.

У большасці казак ёсць **казачны пачатак**: «Жылі-былі...», «У некаторым царстве, даўно гэта было...» і **казачны канец**: «...і я там быў, мёд-піва піў. Па вуснах цякло, а ў рот не папала», «Вось вам казка, а мне — абаранкаў вязка».

Героямі казак могуць быць звычайныя людзі і жывёлы, розныя чарадзеі і чарадзейныя прадметы.

ссяче́, срэ́б-ра-на-е, шар-сці́н-ка, пры-яз-джа́-е

## Каток — залаты лабок

Жыў дзед з бабаю. Былі яны вельмі бедныя: ні насіць няма чаго, ні варыць. Баба кажа:

— Вазьмі, дзеду, тапарок, паедзь у лясок, ссячы дубок, завязі на рынак, прадай і купі мукі. Спячом хлеб.

Сабраўся дзед, паехаў у лясок, пачаў секчы дубок. Выскачыў з дуба каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе трэба?



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Дык вось, каточак, мой галубочак, паслала мяне баба ссекчы дубок, завезці на рынак, прадаць і купіць мукі на хлеб.

— Едзь, дзед, дахаты: будзе ў вас мука!

Прыехаў дзед, а ў яго мукі повен засек!

Спякла баба хлеб, сама наелася, дзеда накарміла ды кажа яму:

— Не шкодзіла б цяпер і заціркі наварыць. Ды солі няма. Вазьмі, дзеду, тапарок, паедзь у лясок, стукні ў дубок, ці не выскачыць каток — залаты лабок: папрасі ў яго солі.

* * *

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак: хлеб ёсць — солі няма.

— Едзь, дзед, дахаты: будзе соль!

Прыехаў дзед, а ў яго солі дзежка стаіць.

Наварыла баба заціркі, сама наелася, дзеда накарміла ды кажа яму:

— Не шкодзіла б цяпер і капусткі паспытаць. Вастры, дзед, тапарок, едзь у лясок, стукні ў дубок, ці



Правообладатель Издательский центр БГУ

не выскачыць каток — залаты лабок: папрасі ў яго капусты.

* * *

Навастрыў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.

— Дзед, дзед, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак: хлеб ёсць, соль ёсць — капусты няма.

— Едзь, дзед, дахаты: будзе капуста!

Прыехаў дзед дахаты, а ў яго капусты поўная кадушка! Баба кажа:

— Ай, як добра! Вось каб цяпер яшчэ і сальца... Мы б з табою капусты наварылі, сальцам закрасілі б. Не палянуйся, дзеду: вазьмі тапарок, паедзь у лясок, стукні ў дубок, ці не выскачыць каток — залаты лабок: папрасі ў яго сальца.

* * *

Узяў дзед тапарок, паехаў у лясок, стук у дубок!.. Выскачыў каток — залаты лабок, залатое вушка, срэбранае вушка, залатая шарсцінка, срэбраная шарсцінка, залатая лапка, срэбраная лапка.



Правообладатель Издательский центр БГУ



— Дзед, дзед, што табе трэба?

— Ды вось, каточак, мой галубочак: просіць баба яшчэ сальца да капусты.

— Едзь, дзед, дахаты: будзе сала!

Прыязджае дзед, а ў яго сала кубелец!

Рады дзед і баба. Сталі яны жыць-пажываць, дзецям казкі казаць. І цяпер жывуць, хлеб жуюць, капустаю з салам закусваюць.

Вось вам казка, а мне — абаранкаў вязка.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Дзе́жка** — пасудзіна.
**Кубе́лец** — кадушка, бочка.

**1.** Прачытайце, як апісаны каток — залаты лабок у казцы.
**2.** Якая розніца ў спалучэннях слоў: *залаты лабок — залаты лоб, залатое вушка — залатое вуха, залатая лапка — залатая лапа* і г. д.?
**3.** Дзе вы ўжо сустракалі словы з памяншальна-ласкальным значэннем?
**4.** Як пачынаецца і заканчваецца казка? Прачытайце.
**5.** Якімі яшчэ словамі часта можа пачынацца казка? А заканчвацца?
**6.** Якую казку А. С. Пушкіна нагадвае гэта беларуская народная казка?
**7.** Чаму казка А. С. Пушкіна закончылася для герояў сумна, а гэта — весела і радасна?

зяр-ня́-тка, пра-глы-ну́ць, бо́-бін-кай

## Як курачка пеўніка ратавала

Жылі-былі курачка і пеўнік. Курачка яйкі несла, а пеўнік зярняткі здабываў, курачку частаваў. Выграбе з ямкі зярнятка і кліча курачку:



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Ко-ко-ко, Чубатка, знайшоў зярнятка!

Вось аднойчы выграб пеўнік вялікую бобінку.

«Ну, — думае, — гэтага зярняці курачцы не праглынуць, з’ем хіба сам».

Праглынуў — ды і падавіўся.

Паваліўся пеўнік, ногі задраў і не дыхае.

Падбегла да яго курачка:

— Што з табою, Пеця? Чаму ты ляжыш і не дыхаеш?

— Ой, — стогне пеўнік, — бобінкай падавіўся...

— Як жа цябе ратаваць, Пеця? — пытаецца курачка.

— Трэба, — шэпча пеўнік, — масла дастаць, горла змазаць.

— А дзе яго дастаць?

— У каровы.

Пабегла курачка да каровы:

— Карова, карова, дай мне масла!

— Нашто табе масла?

— Пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

— Добра, — кажа карова, — дам табе масла. Але схадзі спярша да касцоў, папрасі сена.

Прыйшла курачка да касцоў:

— Касцы, касцы, дайце сена!

— Нашто табе сена?



Правообладатель Издательский центр БГУ



— Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

Касцы кажуць:

— Схадзі да пекара, папрасі пірагоў. Пірагі мы з’ядзім, тады і сена накосім.

Прыйшла курачка да пекара:

— Пекар, пекар, дай пірагоў!

— Нашто табе пірагі?

— Пірагі — касцам. Касцы накосяць сена. Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Пекар кажа:

— Збегай у лес, прынясі дроў, каб было на чым пірагі пячы.

Пабегла курачка ў лес і прынесла дроў.

Пекар напёк пірагоў.

Занесла курачка пірагі касцам. Касцы з’елі і накасілі сена.

Прынесла курачка сена карове.

Карова з’ела сена і дала масла.

Пеўнік змазаў маслам горла і праглынуў бобінку.

Праглынуў і зноў весела на ўвесь двор заспяваў:

— Ку-ка-рэ-ку! Чуб-чубатка — маладзец!

Тут і казцы канец.

?! **1.** Прачытайце казку. Вызначце, колькі ў ёй дзеючых асоб.

**2.** Што здарылася з пеўнікам? Прачытайце.

**3.** Пералічыце, да каго звярталася курачка, каб дастаць масла для пеўніка.

**4.** Ці сапраўдным сябрам была пеўніку курачка? Дакажыце.

**5.** Размяркуйце ролі і прачытайце казку.

* **6.** Падбярыце прыказку, якая падыходзіць па сэнсе да казкі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

за-сму-ці́ў-ся, па-тан-ца-ва́ць, пе-ра-сту-па́ць, ра-зя́ў-ле-ным

## Лісіца і гусак

Неяк лісіца злавіла гусака і кажа: «Гусак, гусак, я цябе з’ем!» Засмуціўся гусак, а рабіць няма чаго. Вось ён і гаворыць: «Хай будзе так, лісічка. Толькі дазволь мне перад смерцю патанцаваць».

Ліса адказвае: «Танцуй сабе, а з’есці я цябе яшчэ паспею».

Гусак пачаў махаць крыламі ды з нагі на нагу пераступаць.

Глядзіць лісіца на гусака і смяецца: «Вось дык гусак! Вось дык танцор!»





Правообладатель Издательский центр БГУ

А гусак крыламі махаў, махаў, з нагі на нагу пераступаў, а потым падняўся ў паветра і паляцеў.

Так і засталася лісіца з разяўленым ротам.

?! **1.** Хто ў казцы вам спадабаўся, а хто — не? Чаму?

**2.** Пра лісіцу кажуць, што яна надта хітрая. А ў гэтай казцы якая лісіца?

**3.** З дапамогай чаго гусак захаваў сваё жыццё?

* **4.** Перакажыце казку падрабязна.

вы́-кру-ці-цца, на-та-пы́-рыў, ад-ля-жа́-цца

## Вол і асёл

Жылі на адным двары вол і асёл. Вол рабіў цяжкую работу — у ярме хадзіў, а асёл толькі калінікалі гаспадара ў павозцы вазіў.

Вось аднаго разу прыйшоў з работы вол, цяжка ўздыхнуў.

— Чаго ты, вол, уздыхаеш? — пытаецца асёл. — Мала сена гаспадар падкінуў ці што?

— Не, брат асёл, — адказвае вол, — сена не мала. Ды ўспомніў, што і заўтра зямлю араць трэба. А гэта, браток, не песні табе спяваць: «І-а, і-а...»



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Э, — кажа асёл, — нас, аслоў, дурнямі лічаць, а ты яшчэ дурнейшы, дык і цягнеш сваё ярмо дзень пры дні.

— А што? Ты за мяне пацягнеш?

— Яшчэ чаго захацеў! — сказаў асёл. — Хопіць мне і калёс.

Вол махнуў хвастом:

— Ат, не можаш памагчы, дык лепш памаўчы.

Асёл памаўчаў, а потым зноў за сваё ўзяўся:

— Хочаш, навучу цябе, як ад ярма выкруціцца?

Вол натапырыў вушы, зацікавіўся:

— Ну, ну, навучы, брат асёл. Хоць бы дзень-другі ў хляве адстаяцца ды адляжацца.

— Заўтра, як выведзе цябе гаспадар з хлява, вазьмі ды закульгай, скачы на трох нагах. Вось ён і не паедзе араць на табе.

Ну, вол так зрабіў, як асёл навучыў.

Паглядзеў назаўтра гаспадар на кульгавага вала, пачухаў патыліцу:

— Што ж рабіць? Ці не запрэгчы асла? Ён, відаць, выгуляўся, у хляве стоячы.

І запрог гаспадар асла ў плуг.

Нездарма ж кажуць: «Навучыў на сваю галаву!»

**Ара́ць** — апрацоўваць зямлю плугам.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Ярмó** — драўляны хамут для вупражы рагатай жывёлы.
**Натапы́рыў** — наставіў, падняў.
**Пачýхаць паты́ліцу** — тут: задумацца.

?! **1.** Ці спадабалася вам казка? Чым?
**2.** На што скардзіўся вол? Прачытайце.
**3.** Якую параду яму даў асёл? Раскажыце.
**4.** Чаму парада асла абярнулася супраць яго?
* **5.** Знайдзіце і растлумачце сэнс прыказкі і прымаўкі з казкі.

пры-гля-дá-юцца, за-рá-да-ваў-ся, за-да-вó-ле-ны, пе-ра-дры-жáў

## Ад крадзенага не пасыцееш

Былі ў аднаго чалавека два сыны. Як выраслі яны, бацька сказаў:

— Пара, сыны, за сталую работу брацца. Хто з вас чым хоча заняцца?

Маўчаць сыны — не ведаюць, якую сабе работу выбраць.

— Ну дык пойдзем, — кажа бацька, — у свет, паходзім, паглядзім, што людзі робяць.

Сабраліся і пайшлі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Ідуць так памаленьку, сыны да ўсяго прыглядаюцца, думаюць, якую работу ім выбраць.

Падышлі да адной вёскі. Бачаць — стаіць пры канцы вёскі кузня. Зайшлі яны ў кузню. Прывіталіся з кавалём, пагаварылі.

І зноў далей рушылі.

Падышлі да другой вёскі. Старэйшы сын паглядзеў туды-сюды: не відаць кузні ў гэтай вёсцы. Вось ён і кажа да бацькі:

— А чаму б і тут кузню не паставіць? Я мог бы за каваля застацца. Мне гэта работа падабаецца.

Бацька зарадаваўся: знайшоў, думае, большы сын сабе спосаб да жыцця!

— Добра, — кажа, — будзь кавалём у гэтай вёсцы.

Паставіў ён сыну кузню, той і пачаў кавальскаю справаю займацца.

Людзі яго хваляць, і сам ён сваёю работаю задаволены.

* * *

А меншы сын, колькі ні ходзіць, — ніяк не можа работу па гусце выбраць.

Ідзе ён аднаго разу з бацькам каля лугу. Бачыць — пасецца на лузе вол. А вёска далекавата, і пастуха не відаць.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Ці не пачаць мне, бацька, валоў красці? — кажа сын. — Работа гэта лёгкая, і кожны дзень з мясам буду. Растаўсцею і сам, як вол.

— Крадзі, — кажа бацька. — На тое ж я цябе і ваджу, каб ты сабе які сталы занятак выбраў.

Заняў сын вала і пагнаў дахаты. А бацька кажа:

— Пачакай мяне пры лесе — мне трэба яшчэ ў гэтую вёску заглянуць: там адзін мой знаёмы жыве...

Гоніць сын вала ды ўсё азіраецца, як воўк, ці не бяжыць хто за ім. Пакуль да лесу дагнаў, дык добра-такі перадрыжаў. Аж млосна ад страху зрабілася.

Пачакаў ён на ўзлеску, пакуль бацька вярнуўся. І пагналі разам вала дахаты.

Зарэзалі дома вала, знялі шкуру ды пачалі варыць свежаніну.

Наварылі, бацька кажа сыну:

— Вось што, сынку, давай знімем мерку і паглядзім, хто з нас ад гэтага вала пасыцее.

Узяў ён шнурок. Змераў шыю сабе і сыну і завязаў вузельчыкі.

* * *

Селі за стол. Бацька есць спакойна, а сын усё на дзверы паглядае: ці не ідзе хто вала шукаць?



Правообладатель Издательский центр БГУ

Забрэша сабака, пройдзе ці праедзе хто — сын за мяса ды ў каморку хаваецца... А ў самога рукі і ногі дрыжаць.

І пайшло так дзень за днём.

З'елі, нарэшце, таго вала. Бацька кажа сыну:

— А цяпер давай шыі мераць: хто з нас пасыцеў?

Памералі, дык у бацькі шыя ўдвая патаўсцела, а ў сына ўдвая патанчэла.

Дзівіцца сын:

— Чаму гэта так?

— Бо ты еў крадзенага вала.

— Дык жа і ты крадзенага еў!

— Не, я заплаціў за вала гаспадару і еў, як свайго. Таму я і пасыцеў. А ты як сядзеш за стол, дык страх адразу на шыю скок і душыць! Праз гэта яна і худзее. Ад крадзенага, брат, не пасыцееш!

**Ста́лая рабо́та** — нязменная, разлічаная на доўгі час.
**Па гу́сце** — каб падабалася.

?!

**1.** Раскажыце, як старэйшы сын выбіраў работу.
**2.** Прачытайце, якую работу ён выбраў.
**3.** Чаму малодшы сын не мог знайсці работу?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Ці было страшна малодшаму сыну? Знайдзіце адказ у тэксце.
**5.** Раскажыце, што прыдумаў бацька, каб пераканаць сына, што «ад крадзенага не пасыцееш».
**6.** Хто з герояў вам спадабаўся, а хто — не? Чаму?
**7.** Вызначце, якая гэта казка (вясёлая, страшная, мудрая і г. д.).
**8.** Дайце сваю назву казцы.

да-ча-ка́-ем-ся, ад-ко́р-мле-ных

## Як бедны мужык гусей дзяліў

Жыў адзін бедны мужык. Зіму так-сяк перакідаўся. А прыйшла вясна — хоць зубы на паліцу кладзі. Адна гуска засталася, ды і тая худая.

— Занясу, — кажа мужык жонцы, — я гэту гуску пану. Можа, ён дасць за яе крыху жыта. А там лебяда вырасце — як-небудзь і дачакаемся новага хлеба.

— Добра, — адказвае жонка, — нясі. Нам з гускі мала карысці: без хлеба — і мяса не яда.

Зарэзаў бедны мужык гуску, аскуб і прынёс да пана.

— Што хочаш за яе? — пытаецца пан.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Дарага з пана не вазьму, — адказвае мужык. — Дасі гарцы са два жыта...

Пан падумаў: гуска хоць і худая, але недарагая.

— Ну, добра, — кажа, — куплю тваю гуску. Але падзялі ты яе на маю сям'ю.

— А якая ў пана сям'я? — пытаецца мужык.

— Я, пані мая, два сыны і дзве дачкі.

Мужык падумаў і кажа:

— Пан — галава сям'і, пану і выдзелім галаву. Пані — першая пасля пана асоба — ёй хай шыйка будзе. Сынкі падрастуць трошкі ды пойдуць таптаць бацькоўскія дарожкі — ім няхай будуць ножкі. А дочкам — па крылу, каб хутчэй замуж з дому выляталі.

— А рэшта каму? — пытаецца пан.

— А рэшта мне за тое, што падзяліў, — адказаў мужык.

— Ну і хіцёр жа ты, мужык! — дзівіцца пан. — Удала падзяліў. Нічога не скажаш.

Аддаў пан мужыку гусака і яшчэ мех жыта ў прыдачу.

* * *

Ідзе мужык дахаты, пасвіствае.

Даведаўся пра гэта яго сусед, багаты мужык. Схапіў ён пад пахі цэлых пяць адкормленых гусак і да пана.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Вось, — кажа, — прынёс табе, панок, пяць гусак. Дай мне за іх пяць мяхоў жыта.

Пан кажа:

— Добра, дам табе пяць мяхоў жыта. Але падзялі ты гэтых гусак на шэсць душ маёй сям’і.

Дзяліў, дзяліў багаты мужык гусак — нічога не выходзіць. А тут якраз недалёка бедны мужык праходзіў. Пан паклікаў яго.

— Падзялі ты гэтых гусак, — кажа, — на шэсць душ маёй сям’і. Бо твой сусед зусім бесталковы — не можа падзяліць пяць гусак на шэсць душ.

— Ну, дык будзем дзяліць. Пан, пані і гуска — тройца. Два панскія сынкі і гуска — яшчэ адна тройца. Дзве панскія дачкі і гуска — трэцяя тройца. А я і дзве гускі — таксама тройца.

— Ну, бачыш, — кажа пан да багатага мужыка, — як трэба дзяліць?

Аддаў пан беднаму мужыку дзве гускі, а багатага выгнаў вон.

**Зу́бы на палі́цу кла́сці** — няма чаго есці.

**Га́рнец** — пасудзіна для захавання сыпкіх рэчываў; адзінка вымярэння сыпкіх рэчываў у даўнія часы.

**Рэ́шта** — тое, што засталося.



Правообладатель Издательский центр БГУ

?!

**1.** Як жылі мужык з жонкай?

**2.** Што вырашыў зрабіць мужык?

**3.** Прачытайце, як мужык падзяліў гуску ў сям'і пана.

**4.** Раскажыце, як мужык дзяліў пяць гусак.

**5.** Чаму пан двойчы аддзякаваў беднаму мужыку?

**6.** Што асуджаецца ў казцы? А што ўхваляецца?

**7.** Перачытайце казку ўважліва самі сабе. Вызначце, якія словы і як трэба чытаць за аўтара, а як за мужыка, яго жонку, пана, багатага суседа.

**8.** Прачытайце казку па ролях.

## КАЗКІ РОЗНЫХ НАРОДАЎ

пры-маў-ля́ць, раз-зла-ва́ў-ся

### Як голуб вучыўся гняздо віць

*Літоўская народная казка*

Паклікаў аднойчы голуб да сябе дразда і просіць, каб той навучыў яго гняздо віць.

Дрозд згадзіўся, прынёс некалькі саломінак, палажыў іх. А голуб тут жа — пырх! — сеў на саломінкі і пачаў круціцца ды прымаўляць:



Правообладатель Издательский центр БГУ



— Магу, магу, магу!

Раззлаваўся дрозд і кажа:

— Ну, калі сам можаш, дык навошта мяне просіш?

І паляцеў дадому.

А голуб так і цяпер не ведае, як гняздо віць. Прынясе некалькі саломінак, от і ўсё яго гняздо.

?! **1.** Хто дзейнічае ў казцы?

**2.** Хто каго папрасіў навучыць віць гняздо?

**3.** Як сябе паводзіў голуб? Прачытайце.

**4.** Чаму раззлаваўся дрозд? Знайдзіце адказ у тэксце.

**5.** Ці навучыўся голуб віць гняздо? Растлумачце.

* **6.** Знайдзіце ў раздзеле «Прымаўкі і прыказкі» адпаведную тэксту прыказку.



Правообладатель Издательский центр БГУ

скру-ці́-ла-ся, а-ба-ра́н-кам, зва-рух-не́-цца, пад-ма́н-ваць, па-ды-хо́-дзіць

## Лісіца і воўк

*Руская народная казка*

Жылі сабе дзед ды баба. Дзед і кажа бабе:

— Ты, баба, пячы пірагі, а я запрагу каня ў сані, паеду рыбу лавіць.

Налавіў дзед рыбы поўныя сані. Едзе дадому, аж бачыць: лісіца скруцілася абаранкам, ляжыць на дарозе.

Дзед злез з воза, падышоў, а лісічка не зварухнецца, ляжыць, як нежывая.

— Вось дык знаходка! Будзе маёй старой добры каўнер.

Узяў дзед лісіцу і паклаў на сані, а сам пайшоў спераду.

А лісіца тым часам і пачала скідваць паціхеньку з воза ўсё па рыбцы ды па рыбцы, усё па рыбцы ды па рыбцы.

Паскідала ўсю рыбу і сама ціхенька ўцякла.

* * *

Дзед прыехаў дадому і кліча бабу:

— Ну, старая, добры каўнер я табе прывёз!



Правообладатель Издательский центр БГУ

Падышла баба да саней: няма на санях ні каўняра, ні рыбы. І пачала яна на дзеда сварыцца:

— Ах ты, такі-сякі, яшчэ надумаўся мяне падманваць!

Тут дзед сцяміў, што лісічка тая была не мёртвая. Пабедаваў, пабедаваў, ды нічога не зробіш.

А лісіца тым часам сабрала на дарозе ўсю рыбу ў кучку, села і есць.

Падыходзіць да яе воўк:

— Дзень добры, кумка, хлеб ды соль...

— Я ем свой, а ты збоку пастой.

— Дай мне рыбкі.

— Налаві сам, ды і еш.

— Дык я не ўмею.

— А што тут умець! Я ж, бачыш, налавіла. Ты, кумок, ідзі на рэчку, апусці хвост у палонку, сядзі ды прымаўляй:

— Лавіся, рыбка, і малая і вялікая!

Лавіся, рыбка, і малая і вялікая!

Дык рыба цябе сама за хвост будзе хапаць. Чым даўжэй пасядзіш, тым болей наловіш.

* * *

Пайшоў воўк на рэчку, апусціў хвост у палонку, сядзіць і прымаўляе:

— Лавіся, рыбка, і малая і вялікая!



Правообладатель Издательский центр БГУ

Лавіся, рыбка, і малая і вялікая!

А лісіца ходзіць вакол ваўка і сваё прыгаворвае:

— Ясней, ясней, неба,

Мерзні, мерзні, воўчы хвост!

Воўк пытаецца ў лісіцы:

— Што ты, кума, усё гаворыш?

— Я табе пасабляю, рыбку на хвост наганяю.

А сама зноў:

— Ясней, ясней, неба,

Мерзні, мерзні, воўчы хвост!

Сядзеў воўк цэлую ноч каля палонкі. Хвост у яго і прымёрз. Пад раніцу хацеў падняцца — ды дзе там. Ён і думае: «Уга, колькі рыбы набралася — і не выцягнуць!»

У гэты час ідзе баба з вёдрамі па ваду. Убачыла ваўка і закрычала:

— Воўк! Воўк! Біце яго!

Воўк туды-сюды, не можа выцягнуць хвост. Баба кінула вёдры і давай яго біць карамыслам. Біла, біла, воўк тузаўся, тузаўся, адарваў сабе хвост і кінуўся наўцёкі.

«Ну добра, — думае, — я ж табе адплачу, кума!»

* * *

А лісічка залезла ў хату, дзе жыла тая баба, што па ваду пайшла, наелася з дзяжы цеста, галаву сабе



Правообладатель Издательский центр БГУ

цестам вымазала, выбегла на дарогу, павалілася і ляжыць — стогне.

Ідзе воўк:

— Дык вось як ты вучыш, кума, рыбу лавіць. Зірні, мяне ўсяго збілі.

Лісіца яму кажа:

— Эх, кумок! У цябе хваста няма, затое галава цэлая, а мне галаву разбілі: бачыш — мазгі вылезлі, ісці не магу.

— І праўда, — кажа ёй воўк. — Дзе табе, кума, ісці, садзіся на мяне, я цябе давязу.

Села лісіца ваўку на спіну. Ён яе і павёз.

Вось лісіца едзе на ваўку і ціхенька спявае:

— Біты нябітага вязе,
Біты нябітага вязе.

— Ты што там, кума, усё гаворыш?

— Я, кумок, твой боль замаўляю.

А сама зноў:

— Біты нябітага вязе,
Біты нябітага вязе.

?! **1.** Які настрой выклікала казка? Калі вам было весела, смешна, сумна? Чаму?

**2.** Куды паехаў дзед?

**3.** Як лісіца перахітрыла дзеда?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Што здарылася з ваўком? Чаму ён паверыў лісіцы?

**5.** Што адбывалася далей?

**6.** Чаму пасля сваёй бяды воўк зноў паверыў лісіцы? Які воўк у гэтай казцы?

**7.** Якія малюнкі можна зрабіць да казкі? Апішыце іх словамі, а потым дайце назву кожнаму малюнку.

не-а-до́ль-най, не-на-жэ́р-на-га, па-зба́-ві-цца

## Як стары ліс ільва перахітрыў

*Інгушская народная казка*

Жылі ў лесе ўсялякія звяры. Лес вялікі, і ўсім было добра. Але непадалёку пасяліўся леў і загадаў, каб зайцы яму жывога зайку прыносілі, ваўкі — ваўчаня, лісы — лісяня. Прыйшлося скарыцца, бо хто ж пойдзе насуперак такой неадольнай сіле?

Плачуць звяры, але адносяць грознаму суседу сваіх дзяцей.

Надышла чарга лісам жывую даніну льву несці. Стары ліс думаў-думаў і надумаў, як ад ненажэрнага льва пазбавіцца. Пайшоў ён да льва адзін. Леў убачыў ліса і грозна зарыкаў:



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Ты дзе так доўга бавіўся? Ды яшчэ нічога не прынёс?!

— О магутны леў! Нёс я табе лісяня сваё, але каля вялікага дуба сустрэў мяне іншы леў і адабраў малога.

— Куды ён накіраваўся?

— Калі будзе твая ласка ўстаць і пайсці разам са мной, я пакажу, дзе хаваецца гэты злачынец.

Ішлі яны, ішлі, і спыніўся ліс ля вялікага дуба. Ён падвёў ільва да глыбокага калодзежа, схаванага ў зарасніку, і кажа:

— Вось тут злодзей! Паднімі мяне, і зірнём мы з табой у калодзеж разам.

Леў падняў ліса, і яны зазірнулі ў калодзеж. Там, у вадзе, яны ўбачылі свае адбіткі. Леў падумаў, што ў калодзежы сапраўды іншы леў і трымае лісяня. Раззлаваўся ён, адкінуў старога ліса ўбок, а сам — скок у калодзеж. Там і захлынуўся.

**Скары́цца** — падпарадкавацца.
**Ба́віўся** — гуляў.

**1.** Прачытайце казку самі сабе.
**2.** Назавіце герояў казкі.
**3.** Чаму гаравалі звяры?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Што прыдумаў стары ліс? Раскажыце.
**5.** Як здзейсніў ён сваю задуму? Прачытайце.
**6.** Дайце казцы сваю назву.
**7.** Чым падобна лісіца з казкі «Лісіца і воўк» на старога ліса?
* **8.** Перакажыце казку падрабязна.

пы́р-ха-юць, даж-джо́м

## Тры матылькі

*Нямецкая народная казка*

Жылі-былі тры матылькі — белы, чырвоны і жоўты. Усе дні навылёт толькі і клопату ў іх было, што гуляць і танцаваць. Асабліва калі сонца прыгравала. Пырхаюць матылькі з кветкі на кветку, з адной на другую. Вось дзе весела!

Але аднойчы пайшоў праліўны дождж. Вымаклі матылькі і пачалі шукаць, дзе б схавацца. А дождж усё лье.

Дабраліся матылькі да белай лілеі і кажуць:

— Прымі нас, дазволь ад дажджу схавацца.

Лілея ім у адказ:

— Так і быць, белага матылька ад дажджу схаваю, ён да мяне падобны, а чырвоны і жоўты няхай сабе іншага месца шукаюць.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Тут белы матылёк ёй і кажа:

— Калі ты маіх брацікаў прыняць не хочаш, то і я да цябе не пайду. Лепш нам разам пад дажджом мокнуць!

І паляцелі далей.

А дождж яшчэ гусцейшы лье. Падляцелі матылькі да чырвонага цюльпана і кажуць:

— Прымі нас, дазволь ад дажджу схавацца, мы наскрозь прамоклі.

Цюльпан ім у адказ:

— Добра, чырвонага схаваю, ён на мяне падобны, а белы і жоўты няхай сабе іншага месца шукаюць.

Тут чырвоны матылёк яму і кажа:

— Калі ты маіх брацікаў прыняць не хочаш, то і я да цябе не пайду! Лепш нам разам пад дажджом мокнуць!

І паляцелі далей.

Дабраліся матылькі да жоўтай ружы і кажуць:

— Прымі нас, дазволь ад дажджу схавацца, мы наскрозь прамоклі.

Ружа ім у адказ:

— Жоўтага схаваю, ён да мяне падобны, а белы і чырвоны няхай сабе іншага месца шукаюць.

Тут жоўты матылёк ёй і кажа:



Правообладатель Издательский центр БГУ



— Калі ты маіх брацікаў прыняць не хочаш, то і я да цябе не пайду! Лепш нам разам пад дажджом мокнуць!

Пачула сонца, што за хмарамі хавалася, словы матылькоў і зарадавалася: ёсць жа на свеце сапраўдная дружба! І вырашыла матылькам дапамагчы.

Прагнала сонца дождж і зноў заззяла, сад асвяціла, матылькам крыльцы высушыла. Сталі яны тудысюды лятаць. Гуляюць, танцуюць. З кветкі на кветку пырхаюць. Толькі да лілеі, да цюльпана і да ружы больш не падляталі. Так тыя і засохлі зусім адзінокія. Весяліліся матылькі, кружыліся да самага вечара. А як вечар надышоў, спаць ляглі. Што з імі далей было, пра тое не ведаю. Толькі ведаю, што сяброўства — у любой бядзе апора.



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** Чаму матылькі кожны раз імкнуліся быць разам?
**2.** Чаму сонца прагнала дождж?
**3.** Знайдзіце ў тэксце прымаўку.
**4.** Успомніце прыказкі пра сяброўства або прыдумайце свае.
* **5.**Прыдумайце працяг казкі па плане:
1. Аднойчы пачаўся моцны вецер.
2. Матылькі трапляюць у бяду.
3. Дапамога сяброў.
4. Сяброўства — у любой бядзе апора.

**6.** Як вы думаеце, у чым сэнс гэтай казкі?

раз-гóй-дваў-ся, спа-дзя-вáў-ся, здзé-ка-ваў-ся

## Гнеў пчол

*Азербайджанская народная казка*

Жыў-быў на свеце слон. Змалку ён быў непаседа і забіяка. Ледзь што — лез у бойку. Аднойчы слон абхапіў хобатам дрэва ў лесе і пачаў яго разгойдваць. Яшчэ трошкі — і вырваў бы дрэва з каранямі. А пад тым дрэвам быў домік лясных пчол. Домік разгойдваўся і мог вось-вось разваліцца.

— Браце слон, — папрасілі пчолы, — не разбурай наш дом.



Правообладатель Издательский центр БГУ



— Што мне ваш дом? — адказаў слон. — Захацелася мне пагарэзіць — от я і весялюся.

— Ах, браце слон, — кажуць пчолы, — мы ж не гаворым, каб ты не весяліўся. Але павесяліся, калі ласка, пад іншым дрэвам.

— Нікуды я адсюль не пайду, — заўпарціўся слон. — Вы толькі паглядзіце на гэтую нахабную малечу — самі з муху, а яшчэ хочуць іншых вучыць.

— Браце слон, — папярэдзілі пчолы, — калі ты разбурыш наш дом, мы цябе пакараем.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Рабіце што хочаце, — засмяяўся слон. — Ніхто вас не баіцца.

Пчолы вярнуліся ў свой домік, параіліся са старэйшымі і вырашылі яшчэ раз папрасіць слана не разбураць іхні дом, а калі слон не выканае просьбы — закусаць яго да смерці.

Доўга ўгаворвалі пчолы слана, але слон не звяртаў на іх увагі. Тады пчолы наляцелі на слана, аблялілі галаву, вочы, вушы, хобат, усё цела і джгнулі джаламі. У адзін момант слон распух як гара, зароў на ўвесь лес і кінуўся наўцёкі. Але пчолы не адставалі. Слон выбіўся з сілы і паваліўся на зямлю.

Пчолы акружылі яго і кажуць:

— Ну, як ты адчуваеш сябе цяпер, упарты браце слон?

Ад сораму слон нават галавы не ўзняў.

— Браце слон, — сказалі пчолы, — ты спадзяваўся на сваю моц і здзекаваўся з нас. Дык ведай: так будзе з кожным, хто мучыць слабых.

**Пагарэ́зіць** — пасваволіць.
**Спадзява́ўся** — меў надзею, чакаў таго, што можа адбыцца.
**Здзе́каваўся** — мучыў, зняважліва ставіўся.



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** Ці спадабалася вам казка? Чым?

**2.** Што можна сказаць пра слана? Як характарызуюць слана яго ўчынкі?

**3.** Аб чым прасілі пчолы слана? Пра што папярэджвалі?

**4.** Чаму слон не паслухаўся пчол?

**5.** Як пчолы правучылі слана?

**6.** Які сэнс мае казка? Што яна сцвярджае?

**7.** Перакажыце казку.

та-па-ры́-шча, яд-ло́ў-ца-ва-я, брыль-я́н-та-ва-я

## Бядняк і багацей

*Латышская народная казка*

Бядняк у лесе на беразе ракі сек дрэвы. Толькі раптам сякера — свісь! — і зляцела з тапарышча. У раку ўпала і патанула.

Горка заплакаў бядняк:

— Ай, ай, я няшчасны! Чым цяпер буду дрэвы секчы, на хлеб зарабляць?

У гэты час выходзіць з лесу кульгавы стары, ядлоўцавая барада, нос — яловая шышка, і пытаецца:

— Чаго ты плачаш, добры чалавек? Што з табою здарылася?



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Як мне не плакаць, калі мая сякера ўпала ў раку, а іншую я купіць не змагу! Чым цяпер буду дрэвы секчы, дзецям як на хлеб зараблю?

— Добра, не плач, я табе яе вылаўлю!

Стары скінуў кажух, зняў лапці і скочыў у ваду! Хвіліны не прайшло — вынырнуў з залатой сякерай і кажа:

— На, бяры! Бо гэта ж твая сякера?

— Ах, не! Ах, не! Гэта не мая! — адказвае бядняк.

Нырнуў стары зноў і вынырнуў з сярэбранай сякерай.

— Ой, не, не! Гэта не мая сякера! — крыкнуў бядняк.

Трэці раз нырнуў стары і выцягнуў жалезную сякеру.

— Вось гэта мая! — заскакаў бядняк ад радасці. — Дзякуй табе, дзядок, за добрую дапамогу, за паслугу.

Узяў бядняк сякеру з рук старога і ўжо хацеў было бегчы дадому.

— Гэй! — аклікнуў яго стары. — Калі ты такі праўдзівы і не сквапны — на, вазьмі і гэтыя сякеры, залатую і сярэбраную.

Прыйшоў бядняк дадому з трыма сякерамі і аб усім расказаў сям'і.



Правообладатель Издательский центр БГУ

* * *

Пачуў пра гэтае шчасце адзін багаты сусед. Узяў ён сваю сякеру і пайшоў у лес.

Прыйшоў на тое ж самае месца ля ракі, стук-стук аб дрэва...

Сякера лёгенька была прымацавана да тапарышча — плясь! — і ўпала ў ваду.

Заенчыў багацей:

— Ай, ай, я няшчасны! Ай, ай, я прапашчы!

У гэты час з лесу паявіўся кульгавы стары, ядлоўцавая барада, нос — яловая шышка, і пытаецца:

— Чаго, чалавек, бядуеш?

— Як мне не бедаваць: сек дрэва, сякера з тапарышча зляцела і ўпала ў ваду! Хто мне яе цяпер вылавіць?

— Ну, супакойся, я яе выцягну, — сказаў стары і, скінуўшы кажух, скочыў у ваду.

Хвіліны не прайшло, выплыў з жалезнай сякерай у руках.

— Гэта твая?

— Не, не мая! — адказвае багацей.

Стары зноў апусціўся ў ваду і вынырнуў з сярэбранай сякерай.

— Ці гэта твая?

— Не, не мая! Мая была лепшая!



Правообладатель Издательский центр БГУ

Трэці раз нырнуў стары і выцягнуў залатую сякеру.

— Вось, вось, гэта мая! — зарадаваўся багацей. — Я здалёк яе пазнаў.

Толькі ён гэта сказаў, стары плюхнуўся ў ваду з залатой сякерай — і прапаў.

А багацей, мабыць, яшчэ і сёння на беразе сядзіць і чакае, калі стары вынырне і прынясе яму брыльянтавую сякеру.

**Сяке́ра** — тапор.
**Ядло́вец** — хваёвы куст.
**Скwа́пны** — хцівы, скупы.

**1.** Што здарылася з бедняком?
**2.** Хто выйшаў да яго з лесу? Знайдзіце і прачытайце апісанне героя.
**3.** Што адбывалася далей? Прачытайце.
**4.** Што можна сказаць пра беднага мужыка? Які ён?
**5.** Чаму багацей зрабіў так, што яго сякера ўпала ў ваду?
**6.** Як паплаціўся багацей за сваю сквапнасць?
**7.** Размяркуйце ролі, прачытайце казку.



Правообладатель Издательский центр БГУ

па-пя-рэ́дж-ва-ла, а-ды-хо́-дзі-лі, ад-ва́-жваў-ся, пра-га-ла-да́ў-ся, бя-ры́-це-ся

## Хто не працуе, таму есці не трэба

*Балгарская народная казка*

Расла ў адным сяле прыгожая дзяўчынка Багданка. Песцілі-шкадавалі адзіную дачушку бацька і маці, не прывучалі да працы. Калі вырасла прыгажуня, пачалі да яе сватацца. Але маці ўсіх папярэджвала:

— Наша Багданка не прывучана да працы.

Пачуўшы тое, усе адыходзілі, ніхто не адважваўся ажаніцца з ёй.

Аднойчы прыйшоў да іх стары чалавек і кажа:

— Чуў, што ёсць у вас прыгожая дзяўчына. Хачу ўзяць яе за нявестку.

І ад яго маці не ўтаіла:

— Наша дачушка нічога не ўмее рабіць.

— Не бяда, — сказаў стары. — У нас ніхто нікога не прымушае працаваць. Хто не хоча працаваць, так і сядзіць.

Праз тыдзень згулялі вяселле. На другі дзень пасля вяселля ўсе схапіліся за работу. Толькі Багданка сядзела святочна апранутая і нічога не рабіла.

Сабраліся на абед, селі за стол. Багданка сядзела ўбаку і чакала, калі яе паклічуць. Старэйшыя нявесткі



Правообладатель Издательский центр БГУ

прынеслі ежу, паклалі перад свёкрам вялікі каравай хлеба. Той парэзаў каравай на столькі скібак, колькі душ было за сталом.

— А Багданцы? — спытала свякроў.

— Яна не галодная, — адказаў свёкар. — Калі чалавек не працаваў, ён і не прагаладаўся.

Пад'еўшы, усе зноў узяліся за работу. Багданка зноў сядзела і нічога не рабіла.

* * *

Увечары свёкар зноў парэзаў хлеб на столькі скібак, колькі душ было за сталом.

— А для Багданкі? — спытала свякроў.

— Яна не галодная, — адказаў свёкар. — Хто не працаваў, той не прагаладаўся.

Пасля вячэры ляглі спаць і, стомленыя, хутка паснулі. Лягла і Багданка, але не магла заснуць, перакідалася з боку на бок. Ледзь дачакалася світанку.

Паднялася ціхенька раней за ўсіх, умылася, падмяла двор, падаіла карову.

Паўставалі ўсе, убачылі, што Багданка працуе, пераглянуліся і ўсміхнуліся.

На абед Багданка села разам з усімі. Свёкар разрэзаў хлеб, падаў самую вялікую скібу Багданцы:

— Трымай, Багданка. Сёння ты працавала больш за ўсіх...



Правообладатель Издательский центр БГУ

Прайшло два тыдні. Багданка працавала кожны дзень. На трэці тыдзень прыехалі ў госці яе бацькі. Усе выйшлі іх сустракаць. Багданка выбегла наперад, адчыніла вароты і кажа:

— Мама, тата, злазьце хутчэй з воза і бярыцеся за работу. Тут не гэтак, як у нас. Тут таму, хто не працуе, і есці не даюць.

**Вясе́лле** — абрад шлюбу, урачыстае святкаванне.

**Няве́стка** — жонка сына.

**Свёкар, свякро́ў** — бацькі мужа.

?!

**1.** Якой была Багданка ў бацькоўскай хаце?

**2.** Чаму яна не ўмела нічога рабіць?

**3.** Што здарылася з Багданкай у новай сям'і?

**4.** Як свёкар правучыў нявестку?

**5.** Якая гэта казка (вясёлая, сумная, мудрая)? Чаму?

**6.** Якая прымаўка ёсць у казцы? Знайдзіце яе і прачытайце.

* **7.** Прыдумайце або ўспомніце прымаўку пра працу.

за-мі-ту-сі́-лі-ся



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Разумны казачнік

*Карэльская народная казка*

Жыў у даўнія часы адзін цар. І да таго ён любіў казкі, што дня не мог правесці без іх. А ці лёгка было расказваць таму цару казкі, калі іх усе яму пераказалі, а ён іх праслухаў? Ды мала таго: ты яму не проста казку раскажы, а кожны раз новую, пра якую ён і чуць не чуў. А раскажаш старую, дык абавязкова галаву табе адсякуць. Такое было яго рашэнне, такі быў яго загад. На тое ён і цар.

Вось і настаў дзень, калі ніхто не згадзіўся да цара пайсці. Забегалі міністры, замітусіліся слугі. А цар крычыць:

— Калі не знойдзеце казачніка — усім галовы паздымаю!

Цяпер зразумела, чаго міністры забегалі?

Адно: бегай ці не бегай — ахвотнікаў няма дарэмна сваю галаву аддаць. Не ідзе ніхто, і ўвесь сказ.

Раптам, уявіце, знайшоўся адзін маладзец, адчайная галава! Сам напрасіўся.

— Давайце, — кажа, — я пайду да цара!

Узяў ды і пайшоў.

Цар пасадзіў яго і кажа:

— Расказвай!

А маладзец пачынае:



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Было тое ў часы даўнія, калі мой дзед і твой дзед разам адзін хлеў будавалі, ды такі вялікі, што вавёрка па ім з канца ў канец за цэлы дзень ледзь даскакаць магла. Вось гэта быў хлеў дык хлеў!.. Не чуў?

— Не чуў, — сказаў цар.

— Ну, калі не чуў, — сказаў маладзец, — дык і спі, а я заўтра прыйду.

І пайшоў.

* * *

На другі дзень прыходзіць. Цар яму сам крэсла падстаўляе, кажа:

— Расказвай казку!

А той пачынае:

— Помніш, які хлеў мой дзед і твой дзед пабудавалі? Дык вось, вырасцілі яны ў тым хляве быка, ды такога, што ластаўцы, каб з аднаго яго рога на другі перабрацца, цэлы дзень ляцець трэба было! Пра гэта чуў?

— Не, не чуў!

— Ну, а калі і гэтую казку не чуў, — кажа маладзец смела, — тады кладзіся спаць, а я заўтра прыйду.

Пайшоў і зноў галаву цэлую панёс.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Ляжыць цар, з боку на бок варочаецца, думае: «Вось жа разумны, умее прыдумляць! Але і я не лыкам шыты: розуму не хопіць — хітрасцю адолею. Прычаплюся, і ўсё адно адсякуць табе галаву!»

Раніцай склікаў цар сваіх міністраў і кажа ім:

— Прыходзьце вечарам казкі слухаць. І запомніце: што гэты малойчык ні скажа, вы на тое дружна кажыце, што, маўляў, ужо чулі.

* * *

Прыйшоў маладзец трэці раз. Цар яму крэсла насустрач выносіць. Маладзец і кажа:

— Калі твой бацька і мой бацька па суседству царавалі, твой бацька ў майго бацькі пазычыў сорак бочак золата. Чулі?

А міністры царскі загад помнілі і закрычалі:

— Чулі!

— Ну, калі чулі, — сказаў маладзец, — то тады прыйшоў час — аддавай, цар, даўгі!

Што рабіць? Тут ужо не да пакарання смерцю, не да галавы, сорам вунь які — золата ўзяў і не аддае! Давялося цару заплаціць!

Пачалі золата збіраць, усё сабралі, усю казну чысценька падмялі, і назбіралася ўсяго адна бочка.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Ну, ды наш маладзец не сквапны. Яму і адной бочкі хапіла. Забраў ён золата і паехаў. А цар з таго часу асцерагаўся галовы секчы! І казкі слухаў, ды яшчэ «дзякуй» казаў.

Вось так яно!

**Адча́йная галава́** — смелы чалавек.

?!

1. Раскажыце, які цар жыў у даўнія часы.
2. Чаму яго баяліся людзі? Прачытайце.
3. Каго шукалі доўгі час міністры?
4. Чым закончыліся пошукі?
5. Як маладзец перахітрыў цара?
6. * Намалюйце слоўныя партрэты цара і маладца.
7. Ці дапамаглі цару яго міністры? Чаму?
8. Які вывад зрабіў пасля гэтага выпадку цар?
9. У чым сэнс гэтай казкі?
10. Знайдзіце казачны пачатак і канец у творы.
11. Якімі яшчэ словамі або сказамі могуць пачынацца і заканчвацца казкі?

кня́-жа-цкі, ча-ра-дзе́й-кай, пе-ра-лі-ва́-ецца, а-гле́-дзе-ла-ся, стра-пя-ну́-ла-ся, раз-гне́-ва-ла-ся, су́-джа-на-га



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Хрустальны калодзеж

*Швейцарская народная казка*

Жыла-была ў гарах у замку маладая дзяўчына. Прыгажуня была, толькі ўжо вельмі ганарлівая. Колькі да яе жаніхоў ні сваталася, усім адмаўляла. Ды яшчэ і з насмешкай.

У адзін цудоўны летні дзень з'явіўся ў замку юнак. Спадабаўся ён дзяўчыне, аднак не дазволіў ёй гонар у тым прызнацца. Чаго ён толькі не рабіў — і каштоўнымі падарункамі яе асыпаў, і казкі расказваў, і песні спяваў — яна кожны раз яму ў сваёй руцэ адмаўляла. Як ні маліў ён яе, як ні прасіў, не хацела яна стаць яго нявестай, усялякі раз адно толькі слова паўтарала:

— Не!

Аднойчы вечарам пайшлі яны да крыніцы — крыніца з-пад скалы цякла. І сказала дзяўчына:

— Ведаю, што ты можаш мне да дня вяселля трон княжацкі падарыць. Толькі гэтага мала. Хачу, каб замест скалы каля крыніцы ты пабудаваў мне калодзеж з каштоўных камянёў. Тады я стану тваёй нявестай. Але камяні павінны быць чыстыя, празрыстыя, як вада крынічная.

На тым і рассталіся. А матухна таго юнака чарадзейкай была. Расказаў ён ёй, што дзяўчына ад яго патрабуе. Махнула яна чароўнай палачкай, і ў тую ж



Правообладатель Издательский центр БГУ



ноч калодзеж з каштоўных камянёў ля скалы з'явіўся. Пераліваецца калодзеж усімі колерамі вясёлкі. І назвалі яго ў народзе — Хрустальны.

* * *

На другую раніцу кажа дзяўчына юнаку:

— Нічога не скажаш, добры калодзеж ты пабудаваў. Толькі ёсць у мяне яшчэ адно жаданне. Калодзеж без саду мне не патрэбны. Давядзецца табе сад пасадзіць. Тады пайду за цябе замуж.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Расказаў юнак сваёй маці, што дзяўчына ад яго патрабуе. Махнула чарадзейка палачкай — і ўсё навокал расквітнела!

Як вечар апусціўся, прыйшла дзяўчына да крыніцы. Села ля Хрустальнага калодзежа, агледзелася: вакол фіялкі ды ружы пунсовыя распусціліся, дрымучы лес квітнеючым садам стаў. Пакрылася зямля кветкамі, у кустах птушкі заспявалі. Вось дзе прыгажосць!

У дзяўчыны сэрца ад радасці так і страпянулася. Падышоў да яе юнак, і захацелася ёй нявестай яго назвацца. Але тут раптам убачыла свой замак, і падаўся ён старым і непрыгожым. Вось яна і кажа:

— Цудоўны гэты сад. Толькі ёсць у мяне яшчэ адно жаданне: хачу я замест старога замка новы, ды не просты, а ўвесь з рубінаў і жэмчугу. Тады пайду за цябе замуж.

Расказаў юнак сваёй маці, чаго дзяўчына ад яго патрабуе. Разгневалася яна, палачкай сваёй махнула, і ўмомант цудоўны сад як скрозь зямлю праваліўся. І калодзеж зноў лясной крыніцай стаў. Кожны вечар да лясной крыніцы цудоўная дзяўчына прыходзіла, суджанага свайго чакала. Але ён так і не вярнуўся. Зразумела яна: капрыз да дабра не прыводзіць!



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** Які настрой выклікала казка?

**2.** Якой была дзяўчына, што жыла ў замку? Апішыце яе словамі.

**3.** Чаму яна не хацела выходзіць замуж за юнака?

**4.** Што яна кожны раз патрабавала ад юнака? Раскажыце.

**5.** Чаму разгнevалася чарадзейка?

**6.** Ці справядліва была пакарана дзяўчына? Паразважайце.

## Добры дзяцел

*Англійская народная казка*

Ці ведаеце вы, што калісьці ў лесе было зусім ціха? Птушкі не ўмелі спяваць.

Адзіным спеваком быў вецер. Ён шумеў у лісці, скрыпеў галінамі дрэў.

І вось аднойчы сабраліся птушкі і пачалі размяркоўваць паміж сабою песні. Кожная з іх хацела атрымаць самую прыгожую.

— Мне хацелася б мець самую пяшчотную песню, — сказала галубка.

— А я ўзяў бы што-небудзь вясёленькае, — сказаў чыж.

Зязюля папрасіла, каб ёй далі што-небудзь незвычайнае.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Толькі шэры салавейка адзінока сядзеў і сціпла маўчаў.

«Няўжо мне нічога не пакінуць? — думаў ён. — Мая жонка так любіць музыку!..»

Дзяцел у гэты дзень аглядаў і лячыў бярозкі ў лесе. Увечары ён скончыў свой абход, прыляцеў на сходку і папрасіў:

— Дайце мне, калі ласка, прыгожую песню. Я заўсёды буду вітаць ёю ўсход сонца.

Яму далі песню. Самую доўгую і самую прыгожую. Але раптам ён заўважыў салаўя.

— А якую песню табе далі? — спытаў дзяцел. — Праспявай яе мне, калі ласка.

— У яго няма песні! — хорам закрычалі птушкі. — Ён нічога не прасіў.

Шкада стала дзятлу салаўя, і ён аддаў яму сваю песню — самую доўгую і самую прыгожую.

Таму дзяцел ніколі не спявае. Але ўсе птушкі любяць і паважаюць яго.

?! **1.** Прачытайце казку самі сабе.
**2.** Якія песні атрымалі птушкі?
**3.** Хто з герояў пакінуў добрае ўражанне? Чаму?
**4.** Як вы расцэньваеце ўчынак дзятла?
**5.** Зрабіце да казкі малюнкі.



Правообладатель Издательский центр БГУ



# ВОСЕНЬСКАЯ СТАРОНКА

пра-ця́г-ва-юць

## Лета надламалася

Канец ліпеня. Пазней пачало ўставаць сонейка. Ды і грэе яно ўжо не так, як раней.

Большасць птушак прыціхла. І толькі нямногія зрэдку ўсё яшчэ працягваюць свае спевы. Але што гэта за песні! Куды толькі, здаецца, дзелася іх весялосць і моц?

Вось на ўзлессі жоўценькая пеначка-вяснянка спявае. Яе песенька гучыць неяк абыякава, ціха.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Быццам чалавек за працай штосьці сабе пад нос мармыча.

Лета надламалася. І, як сведчанне гэтаму, не-не ды і мільгане дзе-небудзь у зялёнай кроне бярозы першы жоўты ліст — вястун залатой восені.

*Рыгор Ігнаценка*

**Абыя́кава** — безуважна, раўнадушна.

**1.** Якія змены адбыліся ў прыродзе ў канцы ліпеня? Раскажыце.

**2.** Прачытайце, як пра гэта піша Рыгор Ігнаценка.

**3.** Чаму аўтар так назваў апавяданне?

**4.** Дайце сваю назву твору.

**5.** Перакажыце апавяданне блізка да тэксту, выкарыстоўваючы словы і выразы: *канец ліпеня, уставаць, сонейка, грэе не так, большасць птушак, нямногія яшчэ, весялосць і моц, пеначка-вяснянка, абыякава, ціха, быццам чалавек, лета надламалася, мільгане, першы жоўты ліст.*

### Загадка

Ляціць без крыл, бяжыць без ног.



Правообладатель Издательский центр БГУ



## Восень

Восень, восень залатая
Сее радасць на зямлі,
Хмарка ў сінім небе тае,
Мкнуць у вырай жураўлі...

Я іду лясною сцежкай,
Як па мяккім дыване.
Восень з ветлівай усмешкай
На спатканне выйшла мне.

Ярка, хораша прыбрала
Ўсюды дрэвы і кусты
І зямлю памалявала
Ў колер жоўта-залаты.

*Сяргей Новік-Пяюн*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Мкнуць** — ляцяць.

**1.** З якім настроем аўтар апісвае восень? Прачытайце радкі, якія падказалі вам настрой аўтара.
**2.** Чаму паэт піша, што па лясной сцежцы ён ідзе, як па мяккім дыване? Растлумачце.
**3.** Вы — мастакі. Якія фарбы выкарыстаеце, каб намаляваць карціну ранняй восені? Апішыце сваю карціну словамі.
**4.** Прачытайце сказы. Падумайце, што было спачатку, а што — потым.
Не спяваюць птушкі.
Прыйшла восень.
Трава парыжэла.
Сонейка грэе мала.
Стала холадна.

са-пса-ва́-ла-ся, гняз-дзе́ч-ка

## Развітальная песня

З самай раніцы ідзе дождж і трымае ў хаце Наташу і Аню. Праз акно дзяўчынкі любуюцца жоўтым уборам клёна, чырвоным адлівам вішні, залацістымі лістамі бярозы.



Правообладатель Издательский центр БГУ



Раптам з двара пачулася песня. Мо здалося? Сёстры прыслухаліся. Не, спяваюць! Наташа глянула ў сад.

На яблыні сямейка шпакоў хорам выводзіла чароўную мелодыю.

— Мама, чаму шпачкі спяваюць пад дажджом? — запытала Наташа.

— Яны ж намокнуць! — бедавала Аня. — Хай бы ў шпакоўні сядзелі.

— Што ж ім рабіць, дзеткі, калі надвор'е сапсавалася? — адказала маці. — Адмяніць канцэрт? Яны ж прыляцелі пасядзець перад далёкай дарогай ля роднага гняздзечка, дзе вывеліся і гадаваліся.



Правообладатель Издательский центр БГУ

* * *

Доўга слухалі дзеці развітальную песню. Аня ледзь не плакала ад жалю. Яна памахала птушкам рукой і крыкнула праз акно:

— Дзякуй, шпачкі! Да пабачэння!

Назаўтра выглянула сонца. Дзяўчынкі выбеглі ў сад: мо зноў убачаць маленькіх спевакоў, пачуюць іх цудоўныя песні. Але ў садзе было нязвыкла ціха і сумна: шпачкі паляцелі ў вырай.

*Паводле Васіля Гурскага*

**Надво́р’е сапсава́лася** — стала дрэнным.

?!

**1.** Які настрой выклікае апавяданне (вясёлы, сумны)?

**2.** Чаму Аня і Наташа не выходзілі на вуліцу? Прачытайце, чым любаваліся дзяўчынкі.

**3.** Што пачулі яны праз акно?

**4.** Чаму шпакі спявалі пад дажджом? Знайдзіце адказ у тэксце.

**5.** Які настрой выклікала песня птушак у дзяцей?

**6.** Апавяданне падзелена на дзве часткі. Дайце назву кожнай частцы.

**7.** Перакажыце апавяданне па частках.



Правообладатель Издательский центр БГУ

ус-тры-вó-жыць

## Восень

...Непрыкметна зусім
Праплыве павуцінкай,
Гляне жоўтым лістком
З-пад зялёнай хусцінкі.

Усплыве туманом
Над рачулкаю соннай,
Устрывожыць дымком
З пахам бульбы пячонай.

Зачаруе агнём
Маладзенькай рабіны,
На адлёце крылом
Памахае буслiным...

*Пятрусь Броўка*

**Непрыкме́тна** — цяжка заўважыць.
**Хусці́нка** — кавалак тканіны, які завязваецца на галаву.

**1.** Ці падабаецца паэту восень? Пацвердзіце адказ тэкстам.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Вызначце радкі, якія найбольш зацікавілі, уразілі вас.
**3.** Як вы разумееце выразы «гляне жоўтым лістком з-пад зялёнай хусцінкі», «зачаруе агнём маладзенькай рабіны»?
**4.** Звярніце ўвагу: паэт гаворыць пра восень, як пра жывую істоту. Якія словы дапамагаюць гэта адчуць? Знайдзіце іх і прачытайце.
**5.** Падрыхтуйцеся да выразнага чытання верша: вызначце, які настрой яму адпавядае; падумайце, дзе трэба зрабіць паўзы, якія словы вылучыць голасам. Прачытайце верш выразна.
**6.** Вывучыце верш на памяць.

### Загадка

За дрэвы хаваецца,
На крыкі адгукаецца,
Спявае, рагоча,
Сустрэцца не хоча.

## СКОРАГАВОРКІ

### Верасень

Вырас верас і цвіце.
Восень, верасень ідзе.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Кастрычнік**

Кастры́ — гара.
Кастры гараць.
Парадак у гаспадара.

**Лістапад**

У садзе ў лістападзе
Апошні лістападзе.
*Васіль Жуковіч*

пры-слу-хо́ў-ва-ецца, за-мі-ту-сі́-ла-ся,
зе-ле-на-ва́-тыя, па-ду́-маў-шы, ні-жэ́й-шым,
пры-гле́-дзеў-ся

## Каралькі-спадарожнікі

Асенні лес — чуйны лес. Ён замірае ў сіняй цішыні і нібы прыслухоўваецца да самога сябе.

Вось трэснулі пад ветрыкам сухія сучкі, птушынай чародкай паляцела з дрэў пабурэлае лісце... І далёка-далёка пайшлі па лесе шолахі — лес нібы ўздыхнуў.

Ходзяць, блукаюць між дрэў шэпты-шолахі. Слухае іх лес, прыслухоўваюся і я з сынам Алеськам — мы вяртаемся з грыбоў.

Раптам пад пахілай бярозкай штосьці замітусілася — нібы мышкі, нібы лісце. Спыніліся мы, пераглянуліся. А «мышкі» тым часам загайдаліся на кончыках галінак.

— Каралькі! — радасна пазнаў птушак мой Алеська.



Правообладатель Издательский центр БГУ



— Але ж, яны...

Убачылі каралькі і нас. Зеленаватыя, варушкія, яны яшчэ жвавей запырхалі на бярозцы. І весела зацінькалі, нібы якія лясныя гадзіннічкі: ці-ці-ці... — здалося, яны віталіся са мной і Алеськам.

Пайшлі далей. Каралькі таксама падаліся за намі. Пырх-пырх-скок... З сучка на сучок, з сасонкі на сасонку.

— А чаму яны, тата, усё пад дрэвамі лятаюць? — нечакана запытаўся Алеська.

— Тут, відаць, сынок, — падумаўшы, адказаў я, — адгадка такая: унізе ж пры зямлі заўсёды цяплей, чым угары. Ды тут, у кары дрэў, і мошак болей. Дробныя птушкі, калі захаладае, заўсёды селяцца на ніжэйшым паверсе лесу. Але ты вось што скажы мне, сынок: чаму гэтыя крылацікі завуцца каралькамі? І на



Правообладатель Издательский центр БГУ

красу яны сціплыя, і самі такія маленькія.... А вось жа глядзі ты — каралькі. Нібы дзеткі якога ляснога караля! Асаблівая, выходзіць, птушка.

Прыціх, задумаўся Алеська. І раптам прасвятлеў, радасна крыкнуў у адказ:

— Што ты кажаш, татка?! Паглядзі, якія ў іх прыгожыя чубчыкі-грабеньчыкі! Як маленькія кароны!

— І праўда, сынок, — больш пільна прыгледзеўся я да птушак і пагладзіў малога па галоўцы...

*Паводле Міхася Вышынскага*

**Чу́йны** — які звяртае на ўсё ўвагу.
**Шо́лахі** — лёгкае, ледзь чутнае шапаценне.
**Варушкі́я** — ледзь прыкметна рухомыя.

**1.** Чаму ў апавяданні гаворыцца, што «асенні лес — чуйны лес»? Знайдзіце адказ у тэксце.
**2.** Ад імя каго вядзецца гаворка ў апавяданні?
**3.** Што ўбачылі ў асеннім лесе бацька з сынам?
**4.** Знайдзіце ў тэксце апісанне каралькоў і прачытайце.
**5.** Чым цікавыя гэтыя птушачкі?
**6.** Чаму іх называюць каралькамі?
**7.** Ці назіральны хлопчык Алеська? Адкуль гэта бачна?



Правообладатель Издательский центр БГУ

* **8.** Перачытайце апавяданне. Падзяліце яго на часткі. Дайце назву кожнай частцы. Коратка перакажыце апавяданне.

**Восень дрэвы падпаліла**

Свеце брат сказаў Даніла:
— Восень дрэвы падпаліла.

І яна сама ў скверык
Завітала, каб праверыць...
Пэўна, здагадаўся вецер,
Што лісток патрэбен Свеце.

Ён дыхнуў — і з шапкі клёна
Ліст упаў, як жар чырвоны.
Яго Света падымае,
Ён... халодны, а пала́е.

*Паўлюк Прануза*

**Заві́таць** — наведацца, заглянуць.
**Пэ́ўна** — відаць.
**Пала́е** — гарыць.

?! **1.** Чаму Света не паверыла брату? Як яна зразумела яго словы?



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Ці можна інакш растлумачыць Данілавай сястрычцы, якая з’ява адбылася ў прыродзе?
**3.** Звярніце ўвагу на словы, якія выкарыстоўвае аўтар для апісання лістка клёна.
**4.** Намалюйце словамі карціну, якую перадаў паэт у вершы.
**5.** Вывучыце верш на памяць.

## Загадка

Яно для ўсіх нас —
Добры друг,
Хоць дзіваком здаецца,
Што надзяе вясной кажух,
А ўвосень раздзяецца.

*Ніл Гілевіч*

за́-ма-раз-каў, па-дзя́-ка-ва-лі

## Кастрычнік

Трэ Кастрычнік лён, аж кастрыца ляціць стаўбом. Спяшаецца ён да замаразкаў кужаль выткаць і вопратку сабе пашыць. Пачулі пра замаразкі павучкі і напалохаліся.

— Ой, што нам рабіць? — пачалі бедаваць. — Змерзнем мы ў замаразкі, загінем без вопраткі.



Правообладатель Издательский центр БГУ



І пайшлі павучкі да Кастрычніка, каб той навучыў іх ткаць кужаль.

— Добра, навучу, — згадзіўся Кастрычнік і даў кожнаму павучку льну па снапочку.

— Перш-наперш гэты лянок трэба вымачыць, потым высушыць, затым пацерці, — навучаў ён павучкоў. — Далей трэба лянок вытрапаць і вычасаць, кудзелечку скласці і танюсенька спрасці. Нітачкі тыя ў аснову на кросенкі навіць. Нарэшце нітачку ў чаўнок, і тчыце сабе кужалёк!

Падзякавалі павучкі Кастрычніку і ўзяліся за работу. Прадуць павучкі кужалёк, а што далей з ім рабіць, забыліся. Адны кажуць: «Трэба зноўку кужалёк мачыць!» Другія пярэчаць: «Трэба сушыць!» Трэція крычаць: «Трэба часаць!» А да ладу не могуць дайсці.

Так кожны год і спрачаюцца паміж сабою павучкі. Напрадуць нітачак, цягнуць іх па зямлі і не ведаюць,



Правообладатель Издательский центр БГУ

што далей з імі рабіць. І ляціць разам з маленькімі павучкамі над палямі беленькі кужалёк — бабіна лета.

Паглядзіце ў кастрычніку на палі, лугі, лясы... Колькі таго серабрыстага кужалю павучкі напралі!

*Клаўдзія Каліна*

**Кастры́ца** — адходы, якія атрымліваюцца ў выніку пераціранння сцябла льну.
**Ку́жаль** — палатно.
**Во́пратка** — адзенне.
**Кро́сенкі** — ткацкі станок.

**1.** Ці спадабалася вам казка? Чым?
**2.** Колькі герояў дзейнічае ў казцы? Назавіце іх.
**3.** Аб чым папрасілі павучкі Кастрычніка?
**4.** Як атрымліваецца вопратка з ільну?
**5.** Знайдзіце ў тэксце радкі, якія ўразілі, здзівілі вас. Раскажыце, чаму.

стра-ся-ну́ў-ся, а-гле́-дзе-ла-ся

## Бульбінка і вінаград

Аднойчы ў Ташкент прывезлі бульбу. Калі ехалі па старой вуліцы, кузаў страсянуўся — і адна бульбінка выпала.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Ой, ой! — тоненькім голасам закрычала яна. — І так бакі баляць ад доўгай дарогі, а тут яшчэ аб камень стукнулася.

Ніхто не звярнуў увагі на бульбінку. Толькі маленькі хлопчык, які гуляў непадалёку з мячыкам, падняў яе і шпурнуў за плот. І ўпала бульбінка ў сад, на мяккую траву. Агледзелася і бачыць: каля слупка расце вінаград.

— Ого, які ты высокі! — здзівілася бульбінка. — Да цябе не дацягнуцца.

— Хто гэта пішчыць? — пачулася ў адказ. — Адкуль ты тут узялася?

— З Беларусі прыехала. Вельмі стамілася: трэслася ў цягніку, потым у машыне. Цяпер адпачываю.

— А чаму ты такая шэрая, непрыгожая?

— Я толькі зверху шэрая, таму што жыву ў зямлі. А знімеш вопратку — я белая, чысценькая.

Вінаград не паверыў:

— Не, ты шэрая! Не тое, што мы, паўднёвыя расліны. Паглядзі сама: жоўтыя дыні, паласатыя кавуны, я, вінаград, зялёны. Куды табе з намі раўняцца!

Бульбінка падумала і адказала:

— Праўда, вы ўсе прыгожыя. Але без дынь, без кавуноў, без вінаграду можна абысціся. А без бульбы? І бабка, і каша, і дранікі — у нас усё з бульбы.



Правообладатель Издательский центр БГУ

А які смачны боршч ці суп, калі ў ім ёсць хоць адна бульбінка! У каго ні спытай, усе любяць бульбу. А вінаградам ласуюцца пасля, пад'еўшы. Цяпер ты разумееш, хто з нас болей патрэбен людзям?

*Леанід Шыпуля*

**Ташке́нт** — горад ва Узбекістане.

?!

**1.** Ці спадабалася вам казка? Чым?
**2.** Хто дзейнічае ў ёй? Назавіце герояў.
**3.** Што расказала бульбінка пра сваё падарожжа?
**4.** Ці прыхільна сустрэлі яе паўднёвыя расліны?
**5.** Прачытайце адказ бульбінкі вінаграду. Ці згодны вы з ім? Растлумачце.
**6.** Прачытайце казку па ролях. Вызначце словы аўтара, бульбінкі і вінаграду. Інтанацыйна перадайце пачуцці кожнага з іх.

## Загадка

Вясна яе хавае,
Лета — ажыўляе.
Восень — дастае,
А зіма — прадае.

*Міхась Пазнякоў*



Правообладатель Издательский центр БГУ



# «МОЙ РОДНЫ КУТ! ЯК ТЫ МНЕ МІЛЫ!»

пра-пра́-дзе-даў, ве-ка-ве́ч-ны-мі, не-злі-чо́-ных

## Беларусь — мая Радзіма

Якая прыгожая назва ў нашай краіны — Беларусь!

А яшчэ мы завём яе — Радзіма.

А яшчэ — Бацькаўшчына.

Радзіма — бо тут мы нарадзіліся, бо яна нам самая родная з усіх краін на цэлым свеце.

Бацькаўшчына — бо яна дасталася нам ад бацькоў нашых. А ім ад іхніх бацькоў — нашых дзядоў. А далей — ад прадзедаў, ад прапрадзедаў... І так — аж да самых далёкіх продкаў.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Над шырокімі палямі, над векавечнымі пушчамі, над зялёнымі лугамі, над блакітнымі стужкамі рэк і рачулак, над люстрамі незлічоных азёр лунаюць у высокім небе белакрылыя буслы. Таму паэт назваў краіну нашу зямлёю пад белымі крыламі.

А колькі багаццяў схавана ў зямлі гэтай! Калійныя солі, якімі ўзбагачаюць глебу, каб яна не бяднела і давала добрыя ўраджаі.

Іх здабываюць беларускія шахцёры пад Салігорскам. Вучоныя-геолагі знайшлі ў нетрах Беларусі і золата, і кажуць, што ёсць нават алмазы. Трэба толькі як след пашукаць...

Жыта ў полі, яблыкі ў садах, свойская жывёла на падворках, звяры ў лясах, рыба ў водах... Ды хіба пералічыш усё!

Але самы вялікі скарб Беларусі — гэта людзі, беларусы.

Побач з беларусамі жывуць у нашых гарадах і вёсках палякі, літоўцы, рускія, яўрэі, татары... — выхадцы з іншых краін. Усе разам мы складаем беларускі народ. Усе мы — грамадзяне незалежнай Рэспублікі Беларусь. Так завецца наша дзяржава. Усе мы павінны памнажаць сваёй працай яе багацці, бараніць ад нягод і напасцяў, як баранілі яе нашы продкі.

*Артур Вольскі*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Луна́юць** — лятаюць.
**Не́тры** — тое, што знаходзіцца пад зямной паверхняй.

?!

**1.** Як пісьменнік ставіцца да сваёй Радзімы? Адкуль гэта бачна?
**2.** Як называюць нашу Радзіму? Чаму? Прачытайце.
**3.** Хто жыве побач з беларусамі? Раскажыце.
**4.** Што павінен рабіць кожны чалавек, каб яго краіна была багатай і моцнай?
**5.** Вызначце настрой твора.
* **6.** Успомніце прыказку пра Радзіму.

ня-зве́-да-ны, пра-зры́-стай, хі-ста́-юцца

## Чароўны край

Сыночку маленькі, ты ручку мне дай,
Цябе павяду я ў нязведаны край.
Мы пойдзем вузенькай мяжою ўдваіх;
Так мякка, што крокаў не ўчуем сваіх,
Так мякка, прыгожа, пахуча... аж рай!
Сыночку маленькі, ты ручку мне дай...
Глянь, жыта красуе на ўзгорку крутым,
Русалкі-дзяўчаткі хаваюцца ў ім.



Правообладатель Издательский центр БГУ



А зайчык, прысеўшы ля самай мяжы,
На жабку міргае: «Дзе я, не кажы».
На лузе зялёным сам бусел стаіць,
А кнігаўка ўецца і просіць: піць-піць!
Шнур гусак на сонцы бліснуў, закрычаў,
Спусціўся і ў лозах-чаротах прапаў.

Па чыстай, празрыстай азёрнай вадзе
Лілея свае карагоды вядзе...
Камарыкі роем лявоніху скачуць...
Ля берага вербы хістаюцца, плачуць...
Чаго яны плачуць? Ты сэрцам згадай...
Сыночку маленькі, ты ручку мне дай...

*Зоська Верас*

**Рай** — тут: прыгажосць.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**1.** Прачытайце верш самі сабе.

**2.** Пра які нязведаны край распавядае аўтар?

**3.** У якое падарожжа запрашае маці сына? Прачытайце.

**4.** Што хоча паказаць маці сыну? Прачытайце.

**5.** Як вы разумееце выразы: «Лілея свае карагоды вядзе, камарыкі роем лявоніху скачуць...»? Чаму «вербы хістаюцца і плачуць...»?

**6.** Знайдзіце словы з памяншальна-ласкальным значэннем. Чаму аўтар так часта іх ужывае?

**7.** Якім пачуццём насычаны верш (радасным, сумным, замілаваным)?

**8.** Падумайце, як трэба прачытаць верш (павольна, хутка).

**9.** Якія карціны і колькі можна намаляваць да верша?

**10.** Размяркуйце, хто які малюнак зробіць алоўкамі. Кожны малюнак падпішыце словамі з верша.

## Мая Беларусь

Наставіўшы белыя вéтразі крылаў, планіруюць буслы. Іх многія і многія тысячы. Гнёзды паўсюль.

І таму, мне здаецца, зямлю нашу, Беларусь, можна назваць зямлёю пад белымі крыламі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Чаму «Беларусь»? Ёсць некалькі варыянтаў паходжання гэтай назвы. Першы: белыя адзенні даўніх вясковых людзей, белыя іхнія валасы, белы колер скуры. Другі. А ён аніяк не супярэчыць з першым. Калі на нашы старажытныя славянскія землі прыйшлі татара-манголы — здолелі адбіцца ад іх амаль адны толькі мы. Мы — адбіліся. І менавіта таму мы «белая», «чыстая ад нашэсця татараў» Русь.

Якая яна, мая зямля? Гэта залатыя палі́ збажыны з сінімі вочкамі васількоў. Гэта светлыя ад бяроз гаі́, што аглухлі ад птушынага звону. Гэта пушчы, падобныя на храмы, пушчы, дзе горда нясуць свае кароны алені. Гэта бясконцыя рэкі, у якіх плешчуцца бабры і рыба на захадзе сонца. Гэта амаль адзінаццаць тысяч азёр, чыстых, як усмешка дзіцяці.

Гэта гераічная зямля. Безліч разоў, з пачатку дзён, грукаталі па ёй калясніцы вайны. Беларусь заўсёды мужна і да канца бараніла сваю праўду і веру.

Ёсць і горкая памяць у маёй зямлі. Дый як інача́й, калі кожны чацвёрты жыхар Беларусі загінуў у апошнюю вайну. Першай прыняла яна ўдары ворага і гераічна змагалася з ім... У лясах амаль чатырыста тысяч партызан цаною жыцця адстойвалі ад ворагаў Радзіму. Дзеля таго, каб аберагчы волю, веру, Бацькаўшчыну.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Пранікніцеся любоўю да роднай Беларусі, дзеці. Велічная і гордая, яна таго вартая.

*Паводле Уладзіміра Караткевіча*

**Ве́тразь** — парус.
**Супярэ́чыць** — не пагаджацца.
**Збажына́** — назва хлебных раслін.

?!

**1.** Аб чым расказвае пісьменнік у творы?
**2.** Якой уяўляе аўтар Радзіму?
**3.** Якая горкая памяць ёсць у нашай зямлі? Раскажыце, выкарыстоўваючы словы з тэксту.
**4.** Як пісьменнік тлумачыць паходжанне назвы нашай рэспублікі? Знайдзіце адказ у тэксце.
**5.** З чаго відаць, што пісьменнік з любоўю ставіцца да сваёй Радзімы?
**6.** Да чаго заклікае вас пісьменнік? Чаму?
**7.** Што новае вы даведаліся пра сваю рэспубліку?
**8.** Закончыце прыказкі пра Радзіму, дадаўшы словы:
У чужой старонцы не так свеціць ...
Дзе маці нарадзіла, там і ...
Родная зямля — маці, чужая старонка — ...
Той герой, хто за Радзіму ...
Словы-памочнікі: гарой, мачыха, сонца, Радзіма.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Край мой

Не залаты зусім, не срэбны
Быў на табе заўсёды ўбор,
Звычайны самы, самы зрэбны:
Зялёны луг ды сіні бор,
Каля дарогі жыта ў полі,
Вярба старая ля ракі
Ды ў жоўтым восеньскім прыполе
Рабін даспелых аганькі.

Ты не сляпіў вачэй, быў просты
Ва ўсе вякі твой родны ўзор:
Гаёў бялюткія бярosты,
Густы блакіт лясных азёр,
І лён, зусім, як неба, сіні,
І ўсе ў рамонках берагі...
Мой беларускі, мой адзіны
Край, ад калыскі дарагі.

*Генадзь Бураўкін*

**Зрэ́бны** — тут: звычайны, просты.
**Рамо́нкі** — кветкі.

**1.** Якія пачуцці перадае паэт Генадзь Бураўкін у вершы? Пацвердзіце словамі з тэксту.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**2.** Якія карціны беларускай прыроды вабяць паэта? Знайдзіце ў тэксце і прачытайце адпаведныя словы.
**3.** На якую адметную рысу нашага краю паэт звяртае ўвагу ў вершы «Край мой»? Назавіце словы, якія дапамагаюць паэту зрабіць гэта.

ад-ра-ка́-ецца, па-ка́-ецца

## Родная мова

Нехта ад мовы сваёй адракаецца...
Прыкладу ты з яго б толькі не браў!
Ён пашкадуе яшчэ і пакаецца,
ён зразумее: сябе абакраў...

Знай, што не ведаць яе — тое самае,
што і душой ачарсцвець, анямець,
што пасварыцца з ласкаваю мамаю,
не шанаваць яе, не разумець.

Мілая мова твая паэтычная,
спеўная і гаваркая яна,
свеціцца ўсёй чысцінёю крынічнаю,
водарам дыхае, быццам вясна.

*Васіль Жуковіч*



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Душо́й ачарсцве́ць** — стаць абыякавым.

**1.** Чаму нельга адракацца ад роднай мовы? Як пра гэта гаворыць паэт?

**2.** Чым занепакоены паэт? Што сказана пра родную мову?

**3.** З чым параўноўваецца беларуская мова? Знайдзіце ў тэксце і прачытайце.

ад-гук-не́-цца, у-ска-лых-не́-цца, за-хлы-не́-цца

### Белая Русь



Шчочку да вуснаў туліць,
каб таямніцу спытаць:
— Белая Русь, матуля,
гэта дзяўчынка?
Так?

Як называецца дзіўна...
Ты пра яе раскажы.
— Белая Русь — Радзіма.
Перад табой ляжыць.

Крыкні — яна адгукнецца
звонам гарачых кос.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Кропля з ліста сарвецца,
ускалыхнецца плёс.

Даль захлынецца громам —
Белая Русь запяе.
І азарыцца Нёман —
чыстае вока яе.

*Данута Бічэль-Загнетава*

**Плёс** — шырокі ціхі ўчастак ракі паміж астравамі.

**1.** Пра што пытала дзяўчынка ў маці? Прачытайце.
**2.** Чаму мама сказала, што «Белая Русь — Радзіма»? Як вы гэта разумееце?
**3.** Якая яна — наша Радзіма? Знайдзіце ў тэксце і прачытайце.
**4.** Ці любіць аўтар сваю Радзіму? Дакажыце.
**5.** Прачытайце радкі ад слова «Крыкні» — і да канца верша. Растлумачце іх сэнс.

## Прыказкі

Родная зямля мякчэй чужой пярыны.
На чужой старане і вясна не красна.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Слухай родную прыроду

У любую пару года,
у пагоду, непагоду
слухай родную прыроду —
ты пачуеш галасы
таямнічае красы.

З лесам, з нівай залатою
размаўляе ветравей,
сонца-сонейка — з зямлёю,
з цішынёю — салавей,
з небам — рэкі і азёры,
хваля — з ніцаю вярбой...
Як і што яны гавораць,
слухай, сябра любы мой.

*Васіль Жуковіч*

**Ні́цаю** — якая схіліла, апусціла галінкі.

**1.** Прачытайце верш.
**2.** Падумайце, да чаго заклікае паэт.
**3.** Што можна пачуць, слухаючы родную прыроду?
**4.** Хто з кім размаўляе ў вершы паэта Васіля Жуковіча? Знайдзіце адказ у тэксце.



Правообладатель Издательский центр БГУ



# ЗІМОВАЯ СТАРОНКА

## Загадка

Зімою хаваюся, вясною з'яўляюся,
летам весялюся, увосень спаць кладуся.

## Чараўніца

З далёкай Поўначы, з краю вечнага снегу і льдоў, на пары белых касматых мядзведзяў, спавітая ў белыя пуховыя тканіны, прыехала да нас Чараўніца. Зачаравала воды нашай мілай зямелькі, і зрабіліся яны камянямі празрыстымі. Зачаравала лясы і паркі нашы, і заснулі яны сном глыбокім. Патрэсла шырокімі рукавамі сваёй пуховай вопраткі, і пакрыліся палі



Правообладатель Издательский центр БГУ

снежнай беллю. І лёг наш край пад нагамі Чараўніцы белы... ціхі... задуменны. Рада яна са свае моцы. Усміхнулася смехам ясным, хоць халодным. І ад гэтага ўсмеху заіскрылася ўсё кругом... І стаіць сярод гэтага мора белі і бляску магутная, грозная, хоць прыгожая, ды бязлітасная, госця наша.

*Зоська Верас*

?! **1.** Хто і адкуль да нас прыехаў?
**2.** Што зрабіла Чараўніца? Прачытайце.
**3.** Чаму ўсмех у Чараўніцы халодны?
**4.** Што гэта за Чараўніца?
**5.** Чаму пра яе сказана: «...магутная, грозная, хоць прыгожая, ды бязлітасная»?
**6.** Якімі словамі можна ахарактарызаваць зіму?
**7.** Падумайце самі, спытайце ў дарослых: што такое снег? Што такое лёд? Калі бывае адліга? Калі вісяць ледзяшы? Чаму сонца мала грэе зімой?

па-зай-здро́с-ціць

## На рэчцы зімою

Не сядзіцца ў хаце
Хлопчыку малому:



Правообладатель Издательский центр БГУ

Кліча яго рэчка,
Цягнуць санкі з дому...
— Мамачка-галубка! —
Просіць ён так міла, —
Можа б ты на рэчку
Пагуляць пусціла?
Я не буду доўга,
Зараз жа вярнуся,
Трошачкі на рэчцы
Ў санках паважуся.
— Ну, ідзі, пабегай,
Толькі апраніся
Ды, глядзі, ў палонку,
Сынку, не ўваліся.
Радасць і раздолле
Хлопчыку малому,
І не пазайздросціць
Ён цяпер нікому!

*Якуб Колас*



?! **1.** Чаму не сядзелася ў хаце хлопчыку? Прачытайце словы хлопчыка да маці з любоўю і пяшчотай.
**2.** Прачытайце, што адказала яму маці, так, каб адчувалася яе хваляванне за сына і любоў да яго.
**3.** Вывучыце верш на памяць.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Знайдзіце ў вершы рыфмаваныя словы: *малому — з дому*.

## Выйшлі пагуляць

Ужо сем гадоў раслі стройнымі радамі хвойкі. Штогод на іх вырастае паясок новых галінак. Лёгка палічыць па гэтых галінках, які ўзрост маладых хвоек.

Прыгожыя яны. Толькі калючыя.

Самая-самая верхавінка маладой хвойкі падобна на вожыка. Вострыя шыпулькі тырчаць угару, у бакі.

Пайшоў снег. Сняжынкі кладуцца і кладуцца паміж шыпулек. Вось ужо шыпулькі зусім схаваліся ў снезе. З'явіліся на верхавінках белыя шапачкі. Сонца свеціць. На шапачках нібы брыльянты іскрацца.

Глядзіш на хвойкі, любуешся імі. Здаецца, быццам многа-многа дзяўчынак у зялёных світках, у белых шапачках выйшлі пагуляць.

*Змітро Бяспалы*

?! **1.** Які гэта твор (сумны, вясёлы, лірычны)? Дакажыце сваю думку.
**2.** Якія радкі з яго найбольш уразілі, здзівілі вас? Чаму?
**3.** Якія малюнкі можна зрабіць да апавядання?
**4.** Дайце сваю назву твору.



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Загадка

Конь бяжыць, шкура ляжыць.

## Снежны дзед



Колькі шуму, колькі смеху:
Дзеда лепім мы са снегу!
Задала зіма работы —
На двары кацілі ўтрох —
І паставілі ля плота.
Дзед стаіць, хоць і без ног.
Замест рук уткнулі палкі,
Вочы — вугалю кавалкі,
Нос — чарэпак з гладыша,
Барада — шматок кудзелі,
А на лысіну надзелі
Кош замест капелюша.
Ну і дзед! Відаць, яму
Тут стаяць усю зіму.
Будзе ён тут па начах
Наганяць на зайцаў страх,
Каб не бегалі сюды
Сад псаваць наш малады.

*Ніл Гілевіч*

**Глады́ш** — пасудзіна, збан без ручкі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

?! **1.** Які настрой выклікаў у вас верш паэта Ніла Гілевіча «Снежны дзед»?

* **2.** Уявіце сабе снежнага дзеда і намалюйце яго слоўны партрэт.

**3.** Прачытайце верш выразна, перадайце радасць, захапленне дзяцей. Рабіце паўзы пры знаках прыпынку.

**4.** Ці спадабаўся вам малюнак мастака да верша?

**5.** Зрабіце свой малюнак.

## Загарэліся сумёты

Загарэліся сумёты,
І вярба гарыць ля плота.
Кот на печы не ляжыць —
Як мага хутчэй бяжыць.
Ведае хітрун стары:
Прыляцелі...

*Васіль Зуёнак*

## Пісьмо птушак

Лёг сняжок пушысты,
Белы, як папера,
А на снезе птушкі
Ў каляровым пер'і.

Снегіры, сініцы,
Галкі-забіякі
На паперы гэтай
Пакідаюць знакі.



Правообладатель Издательский центр БГУ



Цэлую гадзіну
Дзеці прастаялі.
Што гэта за знакі —
І не адгадалі.

Падышоў дзядуля,
Акуляры — ў рукі:
— Зараз адгадаем,
Дарагія ўнукі.

Гэта пішуць птушкі:
Ў іх няма кармушкі,
Просяць хоць бы трошкі
Зерняў, хлебных крошак.

*Аляксей Пысін*

?!

**1.** З чым параўноўваецца снег? Чаму?
**2.** Якія знакі птушкі пакідаюць на снезе? Чаму?
**3.** Знайдзіце ў тэксце і прачытайце, як дзядуля растлумачыў гэтыя знакі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**4.** Аб чым прасілі птушкі дзяцей? Раскажыце.
**5.** Як вы думаеце, чаму абавязкова трэба дапамагаць птушкам зімой?

бру-íцца, тра-скý-чы-я, стру-мé-ніць, а-глé-дзеў-ся

## Крынічка

Крынічка бруіцца ў глыбіні лесу, пад абрывам. Вянком абступілі яе бярозкі і кусты каліны. Паблізу — балотца. Туды і сцякае вада па размытаму раўчуку. У гэтым месцы царства жаб і вужоў. А на ўзгорку, вышэй абрыву, жыве ў нары барсук. Летам і зімой, у траскучыя маразы, б’е-струменіць крынічка. І людзі не абмінаюць яе. Прыходзяць звяры, злятаюцца з усяго лесу птушкі, каб глытнуць вады. Хоць летам хапае лужын, але ж крынічная вада смачнейшая.

Неяк зімой трапіў у той лес і я. Стаяў моцны мароз. Рэчку каля нашай вёскі ўжо скавала лёдам. Іду на лыжах, думаю: няўжо і крынічку мароз-траскун замарозіў? Ціха ў лесе, снег іскрыцца на сонцы, нібы гарыць. Вось і знаёмы бярэзнік, кусты каліны, на якіх сям-там пунсавеюць ягады. Яшчэ не ўбачыўшы крынічкі, пачуў яе прывітальны звон. Дыхае крынічка! Ні мароз яе не скаваў, ні снегам не занесла.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Агледзеўся, а вакол крынічкі — сляды. Прыходзіў лось. Папіў вады, патупаў і пайшоў далей. Заяц таксама праскакаў тут. Гасцілі, бачу, і дзікі.

Напіўся і я з крынічкі вады. І ў біклажку набраў, каб дома дзяцей пачаставаць гаючай, як лекі, вадой.

*Міхась Шаванда*

**Бруі́цца** — цячэ.
**Раўчу́к** — ручай.
**Бікла́жка** — невялікая драўляная ці металічная пасудзіна для вады.
**Гаю́чая** — здольная вылечваць хваробу.

**1.** Вызначце тон апавядання (паважлівы, ласкавы, сярдзіты, замілаваны).
**2.** Прачытайце, чым любуецца і чаму радуецца пісьменнік.
**3.** Раскажыце, як пісьменнік зімой трапіў да крынічкі.
**4.** Намалюйце да апавядання малюнкі.

## Загадка-жарт

Што бяжыць без повада?

па-спа-чу-ва́-ла, а-да-грэ́-ла-ся



Правообладатель Издательский центр БГУ

## Як вавёрачка зіму сустракала

З ранку да вечара стараліся вавёрачкі. У дуплах дрэў назапасілі арэхаў, а на сучках грыбоў насушылі. Толькі адна вавёрачка да зімы не рыхтавалася. Скакала з галінкі на галінку, весялілася. Сонца высока падымецца, а яна яшчэ спіць. Думала, пэўна, што лету канца не будзе.

Тут і восень наступіла. Сонца ледзь свеціць. А то і дождждык імжыць.

Намокла футра ў вавёрачкі, а пагрэцца, абсушыцца няма дзе. Хутка і снег пайшоў, маразы прыціснулі. Холадна стала вавёрачцы. Хоць плач, такое гора звалілася. А побач на елцы домік. Пастукала яна слабай лапкай у акенца: там яе сястрычка жыве. «Ой, ты ж уся ад холаду дрыжыш», — паспачувала сястрычка і запрасіла:

— Хуценька ў домік залазь!





Правообладатель Издательский центр БГУ

Адагрэлася вавёрачка, выспалася. На сняданак сястрычка пачаставала яе духмяным баравічком. Запрашалі ў госці, дапамагалі вавёрачцы і іншыя сястрычкі. Грэлі яе ў сваіх доміках, дзяліліся арэхамі і сушанымі грыбамі.

А калі прыгрэла сонца і пачаў раставаць снег, вавёрачка сказала сваім сястрычкам:

— Дзякуй вам! Не пакінулі мяне ў бядзе. Цяпер і я ведаю, як трэба зіму сустракаць.

*Іван Галубовіч*

?!

**1.** Чаму вавёрачкі так старанна працавалі напярэдадні зімы?

**2.** А што рабіла іх сястрычка? Раскажыце.

**3.** Прачытайце, што здарылася з вавёрачкай зімой.

**4.** Як сустрэлі вавёрачку яе сястрычкі?

**5.** Ці добра яны зрабілі? Чаму?

**6.** Ці зразумела вавёрачка сваю памылку? Дакажыце словамі з тэксту.

**7.** Ці чыталі вы байку І. А. Крылова «Страказа і Мурашка»? Чым падобныя гэтыя творы, а чым адрозніваюцца?

**8.** Праверце сваю ўважлівасць.

1. Дзе снег глыбейшы: у полі ці ў лесе? Чаму?



Правообладатель Издательский центр БГУ

2. Якіх птушак вы часта бачыце каля дома?
3. Дзе халадней зімой: у горадзе ці за горадам?
4. Калі зімой узыходзіць і заходзіць сонца?
5. «Студзень, — гаворыць народ, — да вясны паварот». Чаму?

### Загадка

З неба ўпаў,
Усю зямлю,
Як абрусам, заслаў.

на-ра́-да-ва-цца, па-гла́дж-ваць, ма́-ні-це

## Як Цеплавей з Зімою пазнаёміцца хацеў

Зіма прыйшла лагодная і снежная. Лёгкія хмаркі на сваіх плечыках панавезлі пуховых сняжынак. Нібы матылькі, яны садзіліся на дрэвы, кусты і дахі дамоў, а свавольнік Ветрык здзімаў іх.

Матуля Зіма не магла нарадавацца сняжынкам, а Дзядуля Мароз ад радасці нават ішоў у скокі. Толькі цётка Завея не любіла сняжынак. Яна кожны раз сварылася на іх:

— Ляціце вы назад на свае хмаркі, а то блытаецеся пад нагамі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

Ды як пачне іх сваёй мятлой віхурыць, ажно сонейка свой твар хусткай прыкрывае.

Але аднойчы ноччу з далёкага поўдня пракраўся мяккі Цеплавей. Сцішыўся ён за хатамі і пазірае наўкола. А побач яблынька расла. На яе галлі і заначавалі сняжынкі.

Цеплавей спачатку не заўважыў іх, але як убачыў, дык захацелася яму з тымі сняжынкамі пасябраваць. Падышоў да яблынькі і давай гарачай рукой іх пагладжваць. Напужаліся сняжынкі ды ў слёзы:

— Дзядзечка, не чапай, калі ласка, нас. Мы спаць хочам.

А Цеплавей пагладжвае іх ды пытае:

— А чые вы, дзеткі, будзеце? І чаму адны тут начуеце? Можа, ваша мама — злая чараўніца?

— Не, не, — зашамацелі сняжынкі, — наша мама Зіма. Яна вельмі добрая.

— Дык што, вы сапраўды дзеткі Зімы? — запытаў Цеплавей. — Я шмат пра яе ведаю, а вось пазнаёміцца аніяк не магу. Дзе яе можна сустрэць?

— А яна ўсюды, дзе снег, — сказалі сняжынкі.

— Што вы маніце! — зазлаваў Цеплавей. — Як гэта можна быць адразу ўсюды?

— Праўду мы кажам, праўду, — перабівалі адна адну сняжынкі.



Правообладатель Издательский центр БГУ

— Вось я вас пагладжу зараз! — зазлаваўся Цеплавей. — Мяне ніхто не асмельваўся падманваць.

І ён дакрануўся да сняжынак — тыя ўраз саслізнулі з галінак, як бы прапалі. Тут ён і ўсхадзіўся: носіцца над абшарам, Зіму шукае. Напаткаў Дзеда Мароза ды за бараду яго ўхапіў:

— Кажы, стары, дзе Зіма хаваецца?

Спужаўся Мароз і давай прасіцца:

— Пусці, сынок, не дыхай так горача, а то ў мяне ад твайго цяпла мову адбірае.

Пашкадаваў Цеплавей Мароза, адпусціў, а той шусь пад лёд на возеры і схаваўся. Убачыў гэта ўсё Цеплавей і кажа:

— Ну і хітры ж ты, дзед, але я яшчэ хітрэйшы, — і давай па лёдзе таптацца.

Бачыць Мароз — справы дрэнь. Выскачыў ён з-пад лёду і на хмарку сеў. Хутчэй за Зімою на поўнач у дом свой сцюдзёны паплыў. Праз некаторы час адчуў Цеплавей, што за спінаю хтосьці дыхае. Азірнуўся — і бачыць: дзяўчына кветкаю красуецца, блакітнымі вачыма на яго ўглядаецца.

— Ты хто? — запытаў Цеплавей. — Зіма?

— Не, я Вясна, за табою іду, каб не даць цябе ў крыўду. Квецень наўкола рассыпаю, птушак з выраю сустракаю, сонейка з кожным днём вышэй



Правообладатель Издательский центр БГУ

уздымаю, людзей на сяўбу запрашаю. Я твая сястра малодшая. Хіба ты мяне не пазнаў?

— Пазнаў, сястрыца, пазнаў. Толькі цяпер пазнаў. Парай мне, дзе Зіму адшукаць. Пазнаёміцца з ёю хачу. Дужа цікава мне пра яе Вецер распавядаў.

— Браток мой, Зіма на поўнач падалася. Там яе і шукай.

*Аляксандр Зянько*

**Сваво́льнік** — гарэза, дуронік. Той, хто паводзіць сябе несур'ёзна, легкадумна.
**Ско́кі** — танцы.
**Блы́тацца** — памыляцца.
**Наўко́ла** — вакол.

?!

**1.** Вызначце, колькі ў казцы герояў.
**2.** Хто з іх вам спадабаўся больш? Чым?
**3.** Чаму Цеплавею хацелася сустрэцца з Зімою?
**4.** Як у яго адбылася сустрэча з дзеткамі Зімы? Раскажыце.
**5.** Прачытайце іх размову па ролях.
**6.** Чаму Мароз хаваўся ад Цеплавея?
**7.** Прачытайце, як сустрэўся Цеплавей з Вясною.
**8.** Чаму Зіма падалася на поўнач? Паразважайце.



Правообладатель Издательский центр БГУ

**Адгадкі**

Ляціць без крыл, бяжыць без ног... (Хмара) ... 71
За дрэвы хаваецца... (Рэха)............................ 77
Яно для ўсіх нас — добры друг... (Дрэва)....... 82
Вясна яе хавае... (Бульба) ................................ 86
Зімою хаваюся, вясною з'яўляюся... (Рака).... 99
Конь бяжыць, шкура ляжыць... (Рэчка зімою) 103
Загарэліся сумёты... (Снегіры) ........................ 104
Што бяжыць без повада?.. (Вада) ................... 107
З неба ўпаў... (Снег) ......................................... 110

Правообладатель Издательский центр БГУ

## ЗМЕСТ

Ад аўтараў .................... 3

**З КРЫНІЦ НАРОДНЫХ...** .................... 5

Беларускія народныя песні .................... 5

**Восеньскія песні** .................... 5

Восень мая, восень... .................... 6

**Зімовыя песні** .................... 6

Калядкі .................... 7

Калядкі, калядкі .................... 7

Го-го-го, каза .................... 7

**Масленічныя песні** .................... 8

Наша Масленіца гадавая .................... 8

**Вясновыя песні** .................... 9

Жавароначкі, прыляціце .................... 9

А ты, вясна, ты красна .................... 10

**Летнія песні** .................... 11

Купальская песня .................... 11

**Жніўныя песні** .................... 12

Жніўная .................... 12

**Лірычныя песні** .................... 13

Рэчанька .................... 13

**Жартоўныя песні** .................... 14

Певунок .................... 14

***Гого-гого, гусачок... .................... 15

Лічылкі .................... 16

***Ту́ка-тука́... .................... 16



Правообладатель Издательский центр БГУ

***Бегаў заяц каля плота... 16
***Каціўся яблык... 16
***Тара-бара... 16
Скорагаворкі 17
***Прытупіў пілу Піліп... 17
***Прывучыць сароку... 17
***Каток нітак клубок... 17
Прымаўкі і прыказкі — мудрай мовы прывязкі 18
**Народны каляндар** 18
Восень 18
Зіма 18
Вясна 18
Лета 18
**Радзіма** 18
**Навука, слова** 19
**Праца** 19
**Сяброўства** 19
Легенды 20
Адкуль узнік горад Мінск 20
Адкуль узнікла назва Гомель 21
Беларускія народныя казкі 21
**Народная казка** 21
Каток — залаты лабок 22
Як курачка пеўніка ратавала 26
Лісіца і гусак 30
Вол і асёл 31
Ад крадзенага не пасыцееш 33
Як бедны мужык гусей дзяліў 37



Правообладатель Издательский центр БГУ

Казкі розных народаў ....................................................40
Як голуб вучыўся гняздо віць.
*Літоўская народная казка* ......................................40
Лісіца і воўк. *Руская народная казка*........................42
Як стары ліс ільва перахітрыў.
*Інгушская народная казка*........................................46
Тры матылькі. *Нямецкая народная казка*..............48
Гнеў пчол. *Азербайджанская народная казка*......51
Бядняк і багацей.
*Латышская народная казка*......................................54
Хто не працуе, таму есці не трэба.
*Балгарская народная казка* ......................................58
Разумны казачнік.
*Карэльская народная казка*......................................61
Хрустальны калодзеж.
*Швейцарская народная казка*..................................65
Добры дзяцел. *Англійская народная казка*...........68

**ВОСЕНЬСКАЯ СТАРОНКА** .....................................70
Лета надламалася. *Рыгор Ігнаценка*......................70
Загадка .........................................................................71
Восень. *Сяргей Новік-Пяюн*....................................72
Развітальная песня.
*Паводле Васіля Гурскага*..........................................73
Восень. *Пятрусь Броўка*............................................76
Загадка .........................................................................77
Скорагаворкі ...............................................................77
Верасень ......................................................................77



Правообладатель Издательский центр БГУ

Кастрычнік ........................................................78
Лістапад. *Васіль Жуковіч* ......................................78
Каралькі-спадарожнікі.
*Паводле Міхася Вышынскага* ............................ 78
Восень дрэвы падпаліла. *Паўлюк Пранузa* .......... 81
Загадка. *Ніл Гілевіч*................................................ 82
Кастрычнік. *Клаўдзія Каліна* ................................ 82
Бульбінка і вінаград. *Леанід Шыпуля*.................. 84
Загадка. *Міхась Пазнякоў*...................................... 86

**«МОЙ РОДНЫ КУТ! ЯК ТЫ МНЕ МІЛЫ!»**............... 87
Беларусь — мая Радзіма. *Артур Вольскі*............ 87
Чароўны край. *Зоська Верас* ................................ 89
Мая Беларусь.
*Паводле Уладзіміра Караткевіча* ........................ 91
Край мой. *Генадзь Бураўкін*.................................. 94
Родная мова. *Васіль Жуковіч*................................ 95
Белая Русь. *Данута Бічэль-Загнетава*.................. 96
Прыказкі..................................................................... 97
Слухай родную прыроду. *Васіль Жуковіч*............ 98

**ЗІМОВАЯ СТАРОНКА** ............................................ 99
Загадка ...................................................................... 99
Чараўніца. *Зоська Верас*........................................ 99
На рэчцы зімою. *Якуб Колас* ................................100
Выйшлі пагуляць. *Змітро Бяспалы* ......................102
Загадка .....................................................................103
Снежны дзед. *Ніл Гілевіч* ....................................103



Правообладатель Издательский центр БГУ

Загарэліся сумёты. *Васіль Зуёнак* ........................ 104
Пісьмо птушак. *Аляксей Пысін* ............................ 104
Крынічка. *Міхась Шаванда* ................................ 106
Загадка-жарт .............................................. 107
Як вавёрачка зіму сустракала.
*Іван Галубовіч* .......................................... 108
Загадка ................................................... 110
Як Цеплавей з Зімою пазнаёміцца хацеў.
*Аляксандр Зянько* ........................................ 110

Адгадкі ................................................... 114

Правообладатель Издательский центр БГУ

(Назва і нумар школы)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |
| 20 / 20 | | | |

Вучэбнае выданне

**Варапаева** Валянціна Сцяпанаўна
**Куцанава** Таццяна Сцяпанаўна

**ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ**

Вучэбны дапаможнік для 3 класа спецыяльных агульнаадукацыйных школ
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках
Частка 1

Галоўны рэдактар *Т. Я. Янчук.* Дызайн вокладкі *Л. У. Ледзеневай*
Рэдактар *А. В. Семенчукова.* Мастакі *Ю. В. Качаргіна, Т. А. Сучкова*
Тэхнічнае рэдагаванне і камп’ютарная вёрстка *К. У. Раманчык*
Карэктары *В. М. Іваноў, Н. Б. Кучмель, Т. І. Рыбакова*

У афармленні вокладкі выкарыстаны фотаздымак Віктара Атапіна.

Падпісана ў друк 30.03.2011. Фармат 70×90 1/16. Папера афсетная № 1. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 8,77. Ул.-выд. арк. 3,68. Тыраж 830 экз. Заказ 1044.

Выдавец і паліграфічнае выкананне: рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
ЛИ № 02330/0494361 ад 16.03.2009. ЛП № 02330/0494178 ад 03.04.2009.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.

Правообладатель Издательский центр БГУ